

«ЗНІЖКІ» ДЛЯ ДАЎЖНІКОЎ 7



МУЗЕЮ КАРАТКЕВІЧА БЫЦЬ! 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЛЮТАГА 2020 г. АЎТОРАК № 32 (29146)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Юрый МІКСЮК, дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў:**

*«Пры распрацоўцы тэставых заданняў мы заўсёды прыцягваем высокакваліфікаваных аўтараў — гэта звычайна настаўнікі-практыкі. Затым тэставыя заданні праходзяць шмат стадый унутранай і знешняй экспертызы. У выніку мы гатовыя прадставіць інфармацыю, у якім падручніку, у якім параграфе, на якой старонцы разгледжана тая ці іншая тэма, якая дазваляе рашыць гэтае заданне і за рамкі якой яно не выходзіць. І не варта спрабаваць адгадаць правільны адказ. Верагоднасць угадвання фактычна зведзена да нуля. Таму заклікаю абітурыентаў настройвацца на добрасумленную працу. Трэба прыходзіць і паказваць свае веды. І той, хто будзе лепш падрыхтаваны, і атрымае больш балаў».*

# ПАХОД ПА ЗДАРОЎЕ



**Часлаў і Валянціна ЛЫБАНОВІЧЫ жывуць побач са сталічным Лошыцкім паркам і кожны дзень прыходзяць сюды на прагулкі, найчасцей — прайсціся па скандынаўскай методыцы. Зімою, калі снег ляжыць на алеях і ў старым садзе, Часлаў Баляслававіч і Валянціна Міхайлаўна — на лыжні. Яму — восемдзесят сем, ёй — восемдзесят. Роўна шэсцьдзясят гадоў таму яны, маладыя працаўнікі камвольнага камбіната, пазнаёміліся менавіта тут у час лыжнай прагулкі. Сталі сябраваць, стварылі сям'ю, заўсёды ўдзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці прадпрыемства, выступалі на спартыўных спаборніцтвах. А як выйшлі на пенсію, зноў у парк — па здароўе!**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- Памяць аб спаленых у гады вайны вёсках Гомельскай вобласці ўвекавечаць у мемарыяле ў Оле.
- **Медтавары са скончаным тэрмінам захоўвання паставілі ў адзін з РНПЦ.**
- Банк развіцця выдасць да Br82,8 млн крэдытаў на будаўніцтва і рамонт мясцовых дарог.
- **У Грузіі памёр рэжысёр Георгій Шэнгелая.**
- Усе віды пластыкавага посуду ў аб'ектах грамадскага харчавання могуць забараніць з 2023 года.
- **Колькасць здзелак куплі-продажу кватэр у Мінску ў студзені знізілася амаль на трацціну.**
- Грузчык выкраў на мазырскім прадпрыемстве амаль 2 тоны дызпаліва.

ISSN 1990 - 763X

Разумныя грошы

## Электронныя плацяжы, базавы разліковы рахунак і іншае

### У наступным годзе работнікі прадпрыемстваў змогуць самастойна выбіраць банк для зарплатнага абслугоўвання?

**Перад тым як з галавой акунуцца ў тэму электронных плацяжоў, начальнік Галоўнага ўпраўлення плацежнай сістэмы і лічбавых тэхналогій Нацбанка Тацццяна РУСКЕВІЧ паведаміла аб тым, што праект закона «Аб плацежных сістэмах і плацежных паслугах» плануюць разглядзець у першым чытанні на вясновай сесіі парламента.**

**Пераканаць, каб не спазніцца**

«Яшчэ 7 лютага работнікі Нацбанка расказалі членам Савета Рэспублікі і дэпутатам Палаты прадстаўнікоў пра наш закон. Цяпер дакумент праходзіць апошнія крокі ў Нацыянальным цэнтры заканадаўства і прававых даследаванняў. Прынцыповыя пазіцыі ўзгодненыя. Мы спадзяёмся, што ў першым чытанні закон выйдзе ў гэтую сесію», — адзначыла Тацццяна Рускевіч.

Паводле яе слоў, цяпер хуткімі тэмпамі распрацоўваюцца падзаконныя акты, каб не адцягваць час уступлення закона ў сілу. «Да таго моманту, калі ў парламенце цалкам прымуць закон, падзаконныя акты ўжо будуць гатовыя і можна будзе адразу ж запускаць яго ў жыццё», — заўважыла эксперт. Акрамя таго, яна звярнула ўвагу на тое, што з'яўленне закона паспрыяе паляпшэнню і патанненню працы электронных сэрвісаў, якія ўжо ёсць на рынку. Таксама ён дазволіць з'явіцца ў нас аналагам такіх пляцовак, як Aliexpress, Booking.com, Uber і Yandex.

СТАР. 4

Прыгожае жыццё

## КАСТЫНГІ СКОНЧАНЫ:

### як праходзілі адборы «Міс Беларусь — 2020»



Фота Тацццяны ТКАЧОВАЙ.

**Нацыянальны конкурс прыгажосці ставіць рэкорды. Больш за дзве тысячы кіламетраў праехалі арганізатары, зазірнуўшы ў 126 рэгіёнаў краіны ў пошуку не толькі самых прывабных і абаяльных, але і самых разумных, таленавітых, спартыўных, сацыяльна актыўных, мэтанакіраваных — тых, хто насамрэч можа з годнасцю прымерыць і несці карону новай «Міс Беларусь». Дарэчы, новай у 12-м сезоне конкурсу будзе і сама карона, дызайн якой не змяняўся з 2004 года, — эксперты выбіраюць паміж трыма варыянтамі галоўнай узнагароды з белага золата, тапазаў і фіянітаў.**

СТАР. 5

З першых вуснаў

# «Кожны метр граніцы павінен быць надзейна абаронены»

## Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне на ахову дзяржаўнай граніцы і пракаментаваў рэакцыю расійскіх СМІ з нагоды нафтавай спрэчкі

### БЕЗ ДОМЫСЛАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пагранічная бяспека — найважнейшае пытанне дзяржаўнай палітыкі. «Асабліва ў Беларусі. Па вядомых прычынах. На жаль, выклікаў і пагроз пагранічнай бяспецы з году ў год не становіцца менш, — сказаў ён. — Растуць патокі незаконнай міграцыі, аб'ёмы кантрабанды наркотыкаў, іншых сродкаў злачыннай дзейнасці. ***Павялічваецца ваенная актыўнасць па той бок граніцы. Пры гэтым Беларусь ніколі нікому не пагражала і пагражаць не збіраецца. Як у сферы эканомікі, так і ў сферы ваеннай»***.



Фота БелТА.

Беларускі лідар растлумачыў, што, кажучы пра эканоміку, мае на ўвазе апошнія заявы і шквал крытыкі ў адрас Беларусі з боку Расіі з нагоды быццам бы пагроз ці то спыніць пастаўкі нафты на захад, ці то адбіраць нафту з транзітнага нафтаправода для забеспячэння сваіх нафтаперапрацоўчых заводаў.

«Яшчэ раз хачу падкрэсліць: міжурадавае пагадненне Беларусі і Расіі прадугледжвае пастаўку ў Беларусь 24 мільёнаў тон нафты. Вось і ўсё», — сказаў Прэзідэнт.

### МЕНШ СПАКУС — МЕНШ ПАРУШЭННЯЎ

Летась кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб павелічэнні штатнай колькасці пагранічнага ведамства, стварэнні новых застаў і манеўраных груп. «Мы стварылі шэсць паўнавартасных манеўраных груп, увялі ў строй дзве пагранічныя заставы на ўкраінскім напрамку. Сёлета нам належыць сфарміраваць яшчэ дзве манеўраныя групы і адну пагранічную заставу ў населеным пункце Дзеражычы», — расказаў потым журналістам **старшыня Дзяржпагранкамітэта Анатоль ЛАПО.**

На сустрэчы з кіраўніцтвам пагранічнага ведамства Прэзідэнт указаў на неабходнасць прадметна выкарыстоўваць зацікаўленасць Еўрасаюза ва ўмацаванні супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь па супрацьдзеянні агульным пагрозам. ***«Удасканаленне пагранічнай інфраструктуры абыходзіцца нам нятанна, і мы разлічваем на шырэйшую падтрымку і садзейнічанне. Дарэчы, не толькі з боку Еўрапейскага саюза, бо гэта — наша агульная граніца з Расійскай Федэрацыяй»***, — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У 2019 годзе Дзяржпагранкамітэтам абсталявана 58 новых рубяжоў аховы, больш за 90 кіламетраў загарод для аснашчэння сігналізацыйнымі сродкамі, сігналізацыйнымі комплексамі прыкрыта больш за 97 кіламетраў граніцы. Агульная плошча сігналізацыйнага прыкрыцця рубяжоў па ўсёй граніцы складае каля 610 кіламетраў. Асаблівая ўвага звернута на ўчастак мяжы, які праходзіць па тэрыторыі «зоны адчужэння». Летась у Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведніку тэхнічнымі сродкамі аховы граніцы былі прыкрыты асноўныя аператыўна-значныя напрамкі.

Важным пытаннем Прэзідэнт назваў забеспячэнне транзітнай і турыстычнай прывабнасці Беларусі. «Мы паслядоўна аптымізуем візавую палітыку. Пры гэтым пільнасць на граніцы ніхто не адмяняў. Парушэнні павінны гарантавана выяўляцца, а яшчэ лепш — прафілактавацца і прадухіляцца, — запатрабаваў беларускі лідар. — ***Кожны метр граніцы павінен быць надзейна абаронены, у тым ліку з дапамогай самых сучасных тэхнічных сродкаў. І, канешне, як заўсёды ў нас было — з максімальнай дапамогай мясцовага насельніцтва»***.

> **Да ведама**
>
> **За мінулы год праз дзяржаўную граніцу Беларусі было прапушчана больш за 26 мільёнаў чалавек і 9 мільёнаў транспартных сродкаў.**
>
> **Разам з тым Беларусь па-ранейшаму выкарыстоўвалася для транзіту незаконных мігрантаў і наркатрафіка. «Органамі пагранічнай службы ліквідавана 20 каналаў незаконнай міграцыі, затрыманы 32 арганізатары і паплечнікі, ліквідавана 18 каналаў кантрабанды наркотыкаў, з незаконнага абароту канфіскавана больш за 1 тону наркотыкаў — удвая больш, чым у 2018 годзе», — паведамляе Дзяржпагранкамітэт.**

Старшыня Дзяржпагранкамітэта паведаміў, што роля мясцовага насельніцтва ў прафілактыцы правапарушэнняў на далёкіх подступах да дзяржаўнай граніцы павысілася. «Мы завяршылі стварэнне ў прыгранічны добраахвотных народных дружын. Паставілі гэтую работу на новы ўзровень, удасканалілі яе, улічылі памылкі, якія былі ў мінулым», — сказаў ён.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «КАЛІ ДАЖДЖУ НЕ БУДЗЕ, ЧЭМПІЯНАТ ЕЎРОПЫ І ЭТАП КУБКА МЫ ПРАВЯДЗЁМ ГОДНА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з падрыхтоўкай рэспубліканскага цэнтра па зімовых відах спорту «Раўбічы» да чэмпіянату Еўропы па біятлоне.**

Кіраўнік дзяржавы таксама асабіста разам з камандай апрабаваў трасу, паведамляе прэсслужба Прэзідэнта.

«Калі ўлічваць цяперашнія ўмовы надвор'я (кажуць, гэта не анамалія, а нестандартныя, атыповыя ўмовы), то трэба аддаць належнае тым, хто здолеў, як у народзе кажуць, падцаліць, калі быў невялікі мінус, і нарыхтаваць горы снегу, выкласці трасу», — сказаў лідар краіны.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што нават у паўночных краінах няма снегу і Міжнародны саюз біятланістаў звярнуўся з просьбай, каб чэмпіянат Еўропы і этап Кубка IBU правялі ў Беларусі.

«Шчыра скажу, вельмі хваліюся за гэта, кантралюю. Практычна кожную раніцу мне дакладаюць, што зроблена. А сёння я вырашыў нечакана сваю трэніроўку перанесці сюды і паглядзець. Вядома, траса разбіта, цяпер усё нуль. Таму цяжкавата, асабліва для аматараў. А спартсмены трэніруюцца нармальна. ***Мы зробім трасу.*** Снегу вунь, бачыце, горы настралялі — цэлы дывізіён пушак стаіць, і нашых, і не нашых», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Таму, калі дажджу не будзе, чэмпіянат Еўропы і этап Кубка мы правядзём годна. Не падвядзём міжнароднікаў, якія проста нас папрасілі выратаваць іх, таму што нідзе няма снегу», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Міжнародны саюз біятланістаў IBU цалкам аплачвае падрыхтоўку да правядзення спаборніцтваў.

«Я ўжо не лічу, што прыедуць сюды тысячы чалавек, якія будуць харчавацца, жыць — і ў Мінску, і тут, як гэта было ў мінулыя гады. Таму ў фінансавых адносінах ***гэта акупляецца практычна ўсё, і з вялікім прыбыткам»***, — сказаў кіраўнік краіны.

Разам з тым беларускі лідар падкрэсліў, што для яго галоўнае — нават не фінансавы аспект.

«Галоўнае — заява кіраўніка IBU: за тое, што вы нас падтрымалі, выратавалі, фактычна кажучы, мы падумаем пра тое, каб у найбліжэйшы час ***перадаць у Раўбічы этап Кубка свету — ужо вядучых, самых топавых спартсменаў»***, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

# «МЫ ТУТ ЗМАГАЕМСЯ НА РОЗНЫХ ФРАНТАХ ЭКАНАМІЧНЫХ, АЛЕ ВЫНІК ГЭТЫХ ЗМАГАННЯЎ ЗАЎСЁДЫ ВІДАЦЬ ФІНАНСАВА Ў БЮДЖЭЦЕ»

## Міністр фінансаў Максім Ермаловіч далажыў Прэзідэнту аб сітуацыі з бюджэтам

**Асноўныя пытанні сустрэчы — аналіз галоўнага фінансавага дакумента гэтага года і яго выкананне за 2019-ы.**

«Так ці інакш, даклады ідуць па фінансавых пытаннях, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — ***Мы тут змагаемся на розных франтах эканамічных, але вынік гэтых змаганняў заўсёды відаць фінансава ў бюджэце»***.

Звярнуў увагу лідар краіны на выкананне дакумента па адным з асноўных артыкулаў — заробках бюджэтнікаў. ***«Ці выконваем мы дадзеныя абавязкі?*** Асабліва па той рэформе заработнай платы, пра якую мы казалі. У сродках масавай інфармацыі пішуць рознае, але хацелася б ведаць, як ідуць справы», — звярнуўся да міністра Прэзідэнт.

Міністэрства фінансаў вынесла прапанову па перафармаванні страхавых арганізацый. Кіраўнік краіны запытаў, навошта ведамству гэтыя змены.

### Аб чым ішла размова

Выкананне бюджэту 2019 года аказалася больш рэзультатыўнае, чым было зацверджана першапачаткова. Лепш выкананы мясцовыя бюджэты — абласцей, горада Мінска. Усе абавязкі ў органы казначэйства выкананы ў тэрмін і ў поўным аб'ёме.

«З пункту гледжання заработнай платы вышукваліся дадатковыя рэсурсы, каб забяспечыць асігнаваннямі павышэнне заработнай платы для работнікаў бюджэтнай сістэмы з верасня. У бюджэце знайшлі 160 мільёнаў рублёў, накіравалі гэтыя рэсурсы абласцям на выплату заробкаў і прафінансавалі расходы рэспубліканскага бюджэту», — сказаў журналістам Максім Ермаловіч.

Па выніках студзеня бягучага года бюджэт працуе ў штатным рэжыме.

**• Заработная плата**

З верасня да снежня мінулага года сярэдні заробак у бюджэтным сектары быў на ўзроўні 80 працэнтаў ад сярэднерэспубліканскага. То-бок мэтавы паказчык, зацверджаны кіраўніком дзяржавы, па суадносінах выкананы. Сёлета ён таксама будзе адпавядаць патрабаванню.

«Усе неабходныя рэсурсы на выплату заработнай платы прадугледжаны ў бюджэце, каштарысах бюджэтных арганізацый», — падкрэсліў міністр фінансаў.

Фонд заработнай платы ў бюджэце ў 2019 годзе вырас больш чым на 15 працэнтаў да ўзроўню папярэдняга. На гэты год фонд павялічаны таксама на 15 працэнтаў (ад узроўню 2019-га).

**• Пенсіі**

Яны павышаліся ў жніўні, і з гэтага месяца іх суадносіны з сярэднім заробкам дасягнулі 40 %. Паказчыкі падтрымліваліся і ў другім паўгоддзі.

«Такая сітуацыя будзе захавана і ў 2020 годзе. Усе сацыяльныя абавязкі, як заробкі і пенсіі, так і фінансаванне бюджэтных паслуг, такіх галін, як ахова здароўя, адукацыя, сацыяльная палітыка, у бюджэце прадугледжаны на 2020 год з ростам у параўнанні з 2019 годам», — паведаміў Максім Ермаловіч.

**• Новая сістэма налічэння заробкаў**

Адсочвае яе і Мінфін з пункту гледжання страт бюджэту. Як сказаў Максім Ермаловіч, сёння дастаткова рэсурсаў для забеспячэння гэтых выплат. «Мы рабілі пэўныя выплаты ў снежні за студзень, у прыватнасці, у бюджэтным сектары выплачваліся прэміі снежаньскія — не стандартна ў студзені (у будучым месяцы), а ў бягучым. Акрамя таго, мы авансавалі выплату заработнай платы ў канцы снежня, забяспечвалі выплату па тэрмінах, якія прыпадалі на першы тыдзень студзеня, у снежні», — растлумачыў міністр.

У абласцях для разгляду кожнай канкрэтнай сітуацыі створаны спецыяльныя групы. Мінпрацы таксама ўдзяляе асаблівую ўвагу скаргам ад насельніцтва.

**• Рынак страхавых паслуг**

Згодна з новай рэдакцыяй Указа № 530 былі ўнесены змены ў парадак работы страхавых арганізацый. Дынаміка росту гэтага рынку, па словах міністра фінансаў, вельмі высокая. Штогод страхавыя ўзносы павялічваюцца на 14 працэнтаў, што дазваляе павышаць аб'ём страхавых паслуг на рынку, ствараць новыя прадукты. Абмяркоўваліся на сустрэчы з Прэзідэнтам перспектывы флагмана «Белдзяржстраха». Размова ішла пра тое, як арганізацыя можа працаваць на прасторы ўсяго ЕАЭС.

**• Уплыў нафтавых пытанняў**

«Сітуацыя ў нафтахімічным комплексе таксама будзе ўплываць на выкананне бюджэту на працягу года. Таму задача, якую паставіў Прэзідэнт, заключаецца ў тым, каб планы па фінансаванні дзяржаўных праграм, фінансаванні сацыяльных страт, па падтрыманні заробкаў для бюджэтнікаў, пенсій былі выкананы ўрадам у 2020 годзе», — адзначыў Максім Ермаловіч.

Усё, што запланавана ў расходах мясцовых і рэспубліканскага бюджэтаў у частцы, якая датычыцца насельніцтва, будзе выканана.

**• Еўрабонды**

Па словах міністра, цяпер ідзе падрыхтоўка да іх размяшчэння. Тэхнічная магчымасць выхаду на рынак у Мінфіна будзе ў найбліжэйшы час. Планы па выхадзе еўрабондаў у першым квартале захоўваюцца.

**• Дарожныя зборы**

Мінфін працуе над праектам указа, які змяняе сістэму спагнання платы за дарожную інфраструктуру і ўстанаўлівае яе справядлівы механізм для тых, хто не заўсёды выкарыстоўвае трансарт.

«У цэлым размова ідзе аб захаванні існуючага парадку аплаты дарожнага падатку ці платы за выкарыстанне дарожнай інфраструктуры з пашырэннем ільгот для асобных катэгорый, са змяненнем перыядычнасці аплаты гэтага падатку, са зніжкамі для тых, хто больш працяглы тэрмін гатовы аплачваць дарожны падатак», — канстатаваў Максім Ермаловіч.

Праект указа будзе вынесены міністэрствам на разгляд урада. Плацеж адвяжуць ад тэхагляду, будзе іншая сістэма кантролю.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# КАБ ПАМЯТАЛІ

**15 лютага на Востраве слёз у Мінску ўшанавалі памяць воінаў, якія загінулі ў Афганістане.**

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў агучыў зварот Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што дзесяцігадовы ўдзел у баявых дзеяннях абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў на афганскай зямлі ўжо тады паказаў, наколькі вялікія могуць быць геапалітычныя амбіцыі асобных краін і як высока цэняцца мір, стабільнасць і бяспека.

Ад імя членаў сямей загінулых прамаўляла Тамара Доўнар.

— Штогод люты пераносіць нас назад у 1980-я гады, калі кожная маці, якая праводзіла сына ў войска, думала і малілася — толькі б не ў Афганістан... Дзесяць год «чорныя цюльпаны» прывозілі ў Беларусь труны з целамі салдат і афіцэраў. Але Афганістан у кожнага свой — як у воінаў-інтэрнацыяналістаў, так і ў сямей, куды ўжо ніколі не вернуцца дзеці, мужы, браты... Гэта боль, з якім мы жывем і сёння.

**Міністр абароны Віктар ХРЭНІН** зазначыў, што ў Афганістане воіны-інтэрнацыяналісты прынялі бой з міжнародным тэрарызмам.

— У сучасных умовах выклікаў і пагроз наша дзяржава высока цэніць ролю воінаў-інтэрнацыяналістаў, іх ролю ва ўмацаванні згоды ў грамадстве, выхаванні моладзі ў духу патрыятызму і вернасці Айчыне. Мы заўсёды будзем памятаць тых, хто не вярнуўся з палёў бітваў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Адзін ветэран казаў: «я прачынаўся, калі была цішыня. Падчас страляніны я спаў спакойна», — згадвае **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ.** — Праходзячы цяпер па мосце да помніка, міма партрэтаў загінулых афганцаў, і ўглядаючыся ў твары гэтых хлопцаў, я ўбачыў і свайго аднагодка — сяржанта дэсантнаштурмавой брыгады. Цяпер яму было б столькі гадоў, колькі і мне...

...Адзін пажылы воін-інтэрнацыяналіст прадставіўся Міхаілам. Ён служыў больш за год у Кабуле.

— Калі я вярнуўся назад у Беларусь, то паўгода не мог спакойна спаць. Афганская сталіца ж пастаянна абстрэльвалася, як удзень, так і ўначы. Калі тэрмін службы скончыўся і я перасек савецкую мяжу, то доўга не мог паверыць, што ўсё засталося там, на поўдні...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## На слыху

# УЧОРА Ў «ЗАГОР'Е» ЗАСЯЛІЛІСЯ КІТАЙСКІЯ СТУДЭНТЫ

### Тут і ў «Брыганціне» будуць праходзіць аздараўленне ўсе, хто вяртаецца з КНР

**У Мінскім абласным цэнтры медыцынскай рэабілітацыі размесцяць каля 200 кітайскіх студэнтаў, якія вяртаюцца з радзімы ў Беларусь. Учора ўвечары туды засяліліся 32 з іх, яны прыляцелі прамым рэйсам з Пекіна. Тут яны пройдуць абавязковае аздараўленне і акліматызацыю. Пакуль у Беларусі каранавіруса няма. Усе кітайскія студэнты, акрамя таго што праходзяць каранцінныя мерапрыемствы на радзіме, правяраюцца лабараторнымі метадамі пры прылёце ў аэрапорт Мінск — аналіз робіцца на месцы на працягу некалькіх гадзін. Размяшчаць іх у аздараўленчых цэнтрах на першыя два тыдні пасля вяртання — дадатковая мера бяспекі.**

— У «Загор'і» можа быць пасялена да 200 чалавек. Але варта ўлічваць той факт, што мы падзяляем плыні, каб тыя, хто разам прыляцеў, разам і назіраліся. Адпаведна, калі свабодныя месцы ў пакоі застаюцца і нехта прылятае праз два-тры дні, мы іх засяляем ужо ў асобныя пакоі, — адзначыў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.**

Ён падкрэсліў, што ў аздараўленчыя цэнтры «Брыганціна» (там зараз жыве 149 чалавек) і «Загор'е» засяляюцца здаровыя людзі, якія не маюць патрэбы ў лячэнні. І персанал медустановы будзе прыязджаць на работу і з'язджаць у звычайным рэжыме, бо гэта не каранцінны аб'ект.

— Трэба разумець, што кітайскія студэнты прайшлі каранцінныя мерапрыемствы ў КНР. Таму рызыка заражэння мінімальная і звязаная з пералётам. Усе арганізаваныя мерапрыемствы дазволяць звесці яе да нуля, — падкрэсліў міністр.

Ежу студэнтам будуць гатаваць у мясцовай сталоўцы і прыносіць у пакоі. На паверсе будзе дзяжурыць медсястра. Студэнты будуць выходзіць са сваіх блокаў толькі па неабходнасці і з дазволу медперсаналу, а дыхаць свежым паветрам змогуць на балконах.

Пры гэтым міністр нагадаў, што большасць кітайскіх студэнтаў не выязджала ў Кітай на канікулы.

— Калі мы бачым кітайскіх, карэйскіх, в'етнамскіх, японскіх грамадзян, якія ходзяць у нас па вуліцах, — гэта тыя людзі, якія ў нас вучацца і не пакідалі Беларусь ці завяршылі медыцынскае назіранне. Пацыентаў з каранавірусам у Беларусі няма. Лабараторыя працуе ў кругласутачным рэжыме, аналіз робіцца на працягу некалькіх гадзін. За мінулыя выхадныя пацыентаў з падазрэннем на каранавірус у нас не было. Тым, хто паступіў з прыкметамі віруснай інфекцыі, зрабілі тыпіраванне, каранавірус не пацвердзіўся.

Усяго на канікулы ў Кітай выехала 920 студэнтаў. Плануецца, што да сярэдзіны сакавіка яны будуць вяртацца ў Беларусь.

Па апошніх звестках Дзяржаўнага камітэта па ахове здароўя КНР, колькасць ахвяр каранавіруса ў Кітаі вырасла да 1779 чалавек, з іх 1696 — у правінцыі Хубэй. Усяго зафіксавана 70 548 захварэлых, вылечылася больш за 10,8 тысячы чалавек. Больш за 150,5 тысячы пацыентаў знаходзіцца пад медыцынскім назіраннем.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Шторм «Дэніс» прывёў да паводкі

Моцны шторм «Дэніс» абрынуўся на Вялікабрытанію і Ірландыю, дзе ў дзевяці графствах быў абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі. Тысячы дамоў засталіся без электрычнасці. Па апошніх звестках, загінулі два чалавекі. Іх целы былі знойдзены ў выніку пошукава-выратавальнай аперацыі каля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі. Ва Уэльсе «Дэніс» выклікаў моцную паводку. Быў абвешчаны чырвоны ўзровень небяспекі. За 48 гадзін выпала месячная норма ападкаў, склалася крытычная сітуацыя. У паўднёвай частцы Швецыі метэаралагічная служба папярэдзіла аб моцных вятрах. А ў Бельгіі напярэдадні ўвечары з-за моцных залеў па ўсёй краіне быў абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі. На захадзе Францыі пасля шторму каля 45 тысяч дамоў засталіся без электрычнасці.

## У Індыі дазволілі прызначаць жанчын на камандныя пасады ў войску



Вярхоўны суд Індыі даў жанчынам, якія служаць у арміі, магчымасць займаць камандныя пасады нароўні з мужчынамі, паведаміла выданне Indian Times. Жанчыны змогуць займаць пасады ад палкоўнікаў і вышэй. Афіцэр у званні палкоўніка камандуе батальёнам, які звычайна складаецца з 850 чалавек. Раней урад Індыі паведаміў Вярхоўнаму суду, што мужчыны, якія служаць у арміі, у асноўным набраныя з сельскіх раёнаў і «яшчэ не прайшлі псіхалагічную падрыхтоўку для прыняцця жанчын-афіцэраў у якасці начальнікаў падраздзяленняў». ВС назваў аргументы ўрада «дыскрымінацыйнымі», «трывожнымі» і заснаванымі на стэрэатыпах. Рашэнне суда павінна быць выканана на працягу трох месяцаў.

## У Паўночнай Македоніі распусцілі парламент



У нядзелю дэпутаты прагаласавалі за самароспуск паўночнамакедонскага парламента. «Насустрач датэрміновым парламенцкім выбарам Сход Рэспублікі Паўночная Македонія ў другой палове дня самараспусціўся, затым Джафер (спікер парламента Талат Джафер. — *«Зв.»*) у адпаведнасці з законнымі тэрмінамі падпісаў рашэнне аб правядзенні выбараў 12 красавіка», — паведаміла нацыянальнае агенцтва МІА. Падпісаны спікерам дакумент накіраваны Дзяржаўнай выбарчай камісіі для падрыхтоўкі народнага волевыяўлення.

## Надвор'е

# ЯК У САКАВІКУ

### Уначы будзе прымарожваць, а ўдзень — стабільны плюс

**Чарговы, але ўжо прыкметна аслабелы цыклон «Дэніс» у найбліжэйшы час яшчэ будзе вызначаць надвор'е ў большасці дзяржаў Еўропы, у тым ліку і ў Беларусі. І хоць яго цэнтр знаходзіцца далёка ў Баранцавым моры, на перыферыі ў атмасферы ўсталяваліся заходнія вятры, якія гоняць на ўсход вільготнае цёплае акіянічнае паветра, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Заўтра ўплыў цыклону будзе ўжо нязначны. На большай частцы тэрыторыі краіны ападкі спыняцца, толькі месцамі па поўначы магчымыя кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да плюс 3, удзень — ад плюс 2 да 8 градусаў цяпла.

У чацвер на тэрыторыю нашай краіны прыйдзе наступны атмасферны фронт з Балтыйскага мора. Пад яго уздзеяннем павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. На большай частцы краіны пройдуць мокры снег і дождж. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні ўмераны. Уначы — ад мінус 3 градусаў да плюс 3 градусаў, удзень — 1—7 цяпла. Атмасферны ціск пачне расці ў пятніцу. Чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы ў асобных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы мокры снег, удзень месцамі магчымы ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай чакаюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла, удзень — плюс 1—6 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у гэтыя выхадныя з Атлантыкі да берагоў Скандынаўскага паўвострава падыдзе чарговы шырокі і магутны цыклон. Зноў узмоцніцца вецер. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу з дажджом.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# РАССЛЕДАВАННЕ БУДЗЕ АБ'ЕКТЫЎНАЕ

### Высвятляецца, як 11-месячная дзяўчынка заразілася ВІЧ-інфекцыяй

**У Пінскі міжраённы аддзел Следчага камітэта звярнулася з заявай 35-гадовая мясцовая жыхарка. Яна лічыць, што яе 11-месячная дачка падчас лячэння ў адной з устаноў аховы здароўя заразілася вірусам імунадэфіцыту чалавека.**

Усе члены гэтай шматдзетнай сям'і (двое бацькоў і чацвёра іх старэйшых сыноў) здалі аналізы, якія пацвердзілі, што яны не маюць ВІЧ і, адпаведна, не маглі заразіць дзяўчынку. **Міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК** паабяцаў, што расследаванне сітуацыі будзе аб'ектыўнае. А ў выпадку, калі заражэнне адбылося ў медустанове, вінаватыя будуць пакараны.

— Створана рэспубліканская камісія Міністэрства аховы здароўя, працуе абласная камісія, эпідрасследаванне праводзіць санстанцыя. Мы вывучаем месца, дзе магло заразіцца дзіця. Калі гэта медыцынская ўстанова, то будзе праведзена аб'ектыўнае расследаванне, вінаватыя будуць пакараны, а з бацькамі абмяркуем далейшыя дзеянні па выхадзе з гэтай сітуацыі, — сказаў учора Уладзімір Каранік. — Пакуль рана аб чымсьці казаць. Але, паўтаруся, расследаванне будзе максімальна аб'ектыўнае, і пра яго вынікі мы паведамім.

Упраўленне Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці па дадзеным факце ўзбудзіла крымінальную справу па прыкмятах злачынства, прадугледжанага часткай 2 артыкула 162 Крымінальнага кодэкса. Падчас расследавання давядзецца высветліць, пры якіх абставінах дзіця было заражана ВІЧ. Следчыя апытваюць сведак, медыцынскіх работнікаў, адабрана дакументацыя, якая будзе прааналізавана і далучана да матэрыялаў крымінальнай справы.

**Алена КРАВЕЦ.**


**Уважаемые акционеры ОАО «Обувьторг»!**
**20 марта 2020 года в кабинете директора по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 28, состоится общее собрание акционеров**

**Начало собрания** – 14.00.

**Регистрация участников** проводится с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Повестка дня**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и перспективах развития Общества на 2020 год.
2. О работе наблюдательного совета ОАО «Обувьторг» в 2019 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Обувьторг» за 2019 год.
4. Об утверждении годового отчета и дополнения к положению об учетной политике в целях бухгалтерского и налогового учета на 2020 год, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Обувьторг» за 2019 год.
5. Об утверждении распределения чистой прибыли за 2019 год.
6. О выплате дивидендов за 2019 год.
7. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2020 году и I квартале 2021 года.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Обувьторг».
9. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

**Время и место ознакомления акционеров** с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни, начиная с 13 марта 2020 года по месту нахождения Общества.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра на 20 марта 2020 года.

Наблюдательный совет.

УНП 100262652

На кантролі

# ЯК ДАЕХАЦЬ?

**Падчас маніторынгу стану транспартнага абслугоўвання насельніцтва Аршанскага раёна Камітэтам дзяржкантролю Віцебскай вобласці было выяўлена шмат праблем, якія перашкаджаюць стварэнню ў рэгіёне збалансаванай і якаснай сістэмы грамадскіх перавозак.**

— Віцебскім абласным камунальным транспартным унітарным прадпрыемствам «Апаратар перавозак», на якое аблвыканкамам ускладзены функцыі па арганізацыі перавозак, не праведзены належны аналіз пасажырапатоку. Таксама не ажыццяўляецца належны кантроль за выкананнем раскладу руху транспарту. Маршруты з нізкім пасажырапатокам рацыянальна не размеркаваны паміж філіялам і прыватнымі перавозчыкамі. У выніку перавозку па шэрагу сацыяльна значных гарадскіх маршрутаў ажыццяўляе толькі філіял «Аўтобусны парк № 3 г. Оршы» ААТ «Віцебскаблаўтатранс». Неабходнае ўзаемадзеянне аператара з філіялам адсутнічае, — распавяла **Ірына УЛІЦЁНАК, старшыня Аршанскага міжраённага Камітэта дзяржаўнага кантролю.**

Не забяспечана дакладнае выкананне ўстаноўленых графікаў руху, своечасовае і агульнадаступнае інфармаванне насельніцтва аб рабоце транспарту. Між іншым, летась па праблемах перавозак пасажыраў звярнулася ў райвыканкам больш за 80 грамадзян. З іх па пытаннях невыканання графіка руху — 10. Акрамя таго, у філіяле зарэгістравана некалькі зваротаў аб зрыве рэйсаў. Адной з прычын невыканання графіка руху і зрыву рэйсаў у дырэкцыі філіяла называюць неўкамплектаванасць штатнай колькасці вадзіцеляў. У прыватнасці, на момант праверкі філіялу не хапала дваццаць кіроўцаў — каля 14,5 % ад штатнай колькасці. І пакуль вырашыць праблему з кадрамі не атрымліваецца.

На працягу шэрагу гадоў філіял мае нізкую самаакупнасць і працуе «ў мінусе». Пры гэтым распрацаваны і зацверджаны кіраўніцтвам ААТ «Віцебскаблаўтатранс» шэраг мерапрыемстваў на мінулы год прадугледжваў зніжэнне выдаткаў не на 5 %, як гэта ўстаноўлена комплексам мер, а толькі на 2 %.

— Практычна ўсе маршруты, якія абслугоўваюцца філіялам, стратныя. У ліку прычын — недавер пасажыраў і перавага на карысць прыватных перавозчыкаў. Як вынік, пасажырапаток, які абслугоўваецца аўтобусамі філіяла, не самы вялікі, а атрыманая за рэйс выручка не пакрывае выдаткі на перавозку пасажыраў, — працягвае Ірына Уліцёнак.

З улікам значнасці для Аршанскага раёна якасці транспартных паслуг для насельніцтва, пытанне аб арганізацыі транспартнага абслугоўвання было вынесена на разгляд калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю.

У ходзе выязнога пасяджэння калегіі ў Аршанскім райвыканкаме сумесна з усімі зацікаўленымі былі абмеркаваны праблемныя пытанні і выпрацаваны абавязковыя да выканання крокі па іх вырашэнні... Выкананне пастановы ўзята камітэтам на кантроль.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Грошы

# ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ ДАСЯГНУЛІ 9,2 МЛРД ДОЛАРАЎ

**Міжнародныя рэзервовыя актывы нашай краіны па стане на 1 лютага склалі 9243,1 млн долараў (у эквіваленце), паведамляюць спецыялісты ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

Эксперты Нацбанка адзначаюць, што рэзервы Беларусі знізіліся на 150,4 млн долараў (на 1,6 %). Зніжэнне ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў па выніках студзеня абумоўлена планавым пагашэннем урадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму 556 млн долараў.

Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у студзені спрыялі паступленне замежнай валюты ў бюджэт, павелічэнне кошту манетарнага золата, паступленне сродкаў ад продажу аблігацый Міністэрства фінансаў, намінаваных у замежнай валюце, а таксама купля замежнай валюты Нацбанкам на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы. Згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2020 год аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2021 года павінен складзі не менш за 7,3 млрд долараў.

Рэзервы знізяцца, але не крытычна, заявіў **старшыня праўлення Нацбанка Павел КАЛАУР** на брыфінгу ў сераду. Такім чынам золатавалютныя рэзервы ў Беларусі ў 2020 годзе могуць знізіцца, але застанецца вышэйшыя за прагноз у 7,3 млрд долараў. Галоўны банкір адзначыў, што праўленне рэгулятара прадугледзела ў сваіх прагнозах ніжэйшы ўзровень золатавалютных рэзерваў. «Але гэта не значыць, што ён будзе такі. Так, хутчэй за ўсё, стане меншы, чым на пачатак года. Але ён будзе бліжэйшы да той лічбы, якую мы маем цяпер (каля 9 млрд долараў), чым да той, якую заклалі ў кансерватыўным сцэнарыі (7,3 млрд долараў)», — сказаў Павел Калаур.

Ён падкрэсліў, што ў мэтах забеспячэння ўстойлівасці знешняга доўгу і выканання адпаведных абавязацельстваў было вырашана прытрымлівацца аптымальных аб'ёмаў золатавалютных рэзерваў і не спрабаваць любой цаной давесці іх да пакрыцця трохмесячнага імпарту. «Калі сітуацыя палепшыцца, мы, безумоўна, будзем імкнуцца да таго. А з улікам сённяшняй сітуацыі аптымальны аб'ём пакрыцця імпарту — 2,5 месяца», — дадаў старшыня праўлення.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Электронныя плацяжы, базавы разліковы рахунак і іншае

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У нашай краіне ў гэтым плане створаны добры патэнцыял, і айчынныя кампаніі здольныя прадастаўляць падобныя сэрвісы нашмат лепш, чым замежныя. Мы хочам, каб гэтыя сістэмы максімальна хутка запусціліся ў жыццё, таму што закон дазволіць стварыцца больш якасным сэрвісам, новым працоўным месцам. Таксама гэта рэклама краіны на міжнароднай арэне», — заявіла начальнік упраўлення Нацбанка.

### Базавы — гэта звычайны банкаўскі рахунак, але ёсць нюансы

Як вядома, у нашай краіне плануюць увесці базавы разліковы рахунак для фізічных асоб. У кіраўніцтве краіны нават падрыхтавалі адпаведны праект указа. Што гэта такое?

Адразу папярэдзім — укараненне базавага рахунку сёлета не чакаецца. Бо трэба ўлічыць усе магчымыя нюансы і рызыкі. Таццяна Рускевіч патлумачыла, што базавы рахунак — гэта звычайны банкаўскі разліковы рахунак. Фізічным асобам, якія адкрылі базавыя рахункі, будзе дадзена магчымасць атрымліваць мінімальны пералік банкаўскіх паслуг на базавым рахунку на бязвыплатнай аснове. Грамадзяне будуць мець магчымасць самастойнага выбару банка, у якім ім зручней абслугоўвацца.

«Нейкай спецыфікі людзі не ўбачаць. Разам з тым базавы рахунак вельмі выразна забяспечыць мінімальны набор сацыяльных функцый, якія будуць прадастаўляцца бясплатна, у тым ліку залічэнне заробкаў, пенсій, зняцце наяўных без камісій у інфраструктуры банка», — патлумачыла Рускевіч.

«Але калі чалавек, напрыклад, хоча атрымліваць пенсію наяўнымі, то такая магчымасць нікуды не знікне. Ён гэтак жа будзе хадзіць на пошту і атрымліваць гэтыя грошы. Гэта значыць, мы даем магчымасць выбару для кожнага чалавека і прымушаць нікога ніколі не будзем», — падкрэсліла Рускевіч.

Функцыянал такога рахунку павінен прадугледжваць пералік аперацый, якія банкі будуць ажыццяўляць бясплатна. Пры гэтым плануецца, што кліенту банка пры наяўнасці ў яго бягучага разліковага рахунку не абавязкова будзе адкрываць базавы разліковы рахунак. Гэта бягучы банкаўскі рахунак фізасобы (для індывідуальных прадпрымальнікаў такой магчымасці не будзе).



### Адназначна БЕЛКАРТ, калі атрымаецца

Да базавага рахунку маюць намер выпускаць банкаўскую картку плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ. Рашэнне выпуску карткі гэтай плацежнай сістэмы (дарэчы — нацыянальнай) да базавага рахунку прынялі для таго, каб «абмежаваць плацежныя рызыкі, у тым ліку палітычныя».

Нагадаем, нацыянальная сістэма плацежных карт інтэгравалася з Расійскай «Мір». З 1 студзеня гэтага года банкі павінны выпускаць карткі БЕЛКАРТ альбо з чыпам, альбо з чыпам і магнітнай паласой. Раней карткі гэтай плацежнай сістэмы выпускаліся толькі з магнітнай паласой (за выключэннем карткі БЕЛКАРТ-Maestro). З сярэдзіны студзеня некаторыя банкі пачалі выпуск картак з чыпам. Аднак узніклі праблемы з інфраструктурай. Яе падрыхтоўку банкі могуць ажыццяўляць на працягу ўсяго бягучага года. Калі б базавы разліковы рахунак ўвялі ў гэтым годзе, то яго ўладальнікі маглі б тэарэтычна сутыкнуцца з пэўнымі праблемамі.

«Магчымасць адкрыцця фізічнай асобе базавага бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку павінна забяспечвацца ўсімі банкамі, якія ажыццяўляюць эмісію банкаўскіх плацежных картак унутранай плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ з выдачай банкаўскай плацежнай карткі названай сістэмы», — гаворыцца ў лісце, які Асацыяцыя беларускіх банкаў накіравала фінансавым інстытутам.

### «Адвязацца» ад нязручнага банка

Як нам патлумачылі спецыялісты, плануецца, што пасля адкрыцця базавага разліковага рахунку, яго ўладальнік зможа самастойна выбіраць банк для зарплатнага абслугоўвання.

Цяпер беларускія банкі ў некаторых выпадках, выдаючы крэдыт прадпрыемствам, прапісваюць умовы такім чынам, каб кліенты цалкам перайшлі да іх на абслугоўванне. Гэта значыць, каб усе разлікі, у тым ліку датычныя выплаты зарплаты, праходзілі праз той банк, які выдаў крэдыт. Працадаўцы, у сваю чаргу, перашкаджаюць работнікам у самастойным выбары банка для афармлення зарплатнай карткі.

Банкі тлумачаць свае паводзіны тым, што ім трэба кіраваць крэдытнымі рызыкамі і для гэтага трэба бачыць усе фінансавыя патокі крэдытаатрымальніка. Аднак пакетнае абслугоўванне кліентаў можа прыводзіць да абмежавання канкурэнцыі на рынку. Таму гэтай сітуацыяй зацікавілася Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

### Капейка да капейкі рубель беражэ

У Беларусі стварылі дадатак, які дазваляе плаціць з дапамогай QR-кода. Праграму распрацавалі айчынныя IT-спецыялісты сумесна з банкам. Такі спосаб моцна патанніць для дзяржавы фінансавую інфраструктуру. Бо аплата праходзіць унутры краіны, і міжнародныя плацежныя сістэмы не задзейнічаны. Сістэма ўжо працуе ў Гомелі і ў Барысаве. Там QR-кодам плацяць за праезд у транспарце.

«Дзесьці мы будзем эканоміць палову працэнта, дзесьці — працэнт ад сумы. Але калі гэта будуць мільярды транзакцый, гэта будуць мільёны долараў, якія мы сэканомім для эканомікі нашай краіны. Усё вельмі проста, лёгка і зручна — у той жа час ящчэ і эканамічна, — адзначыў **член Савета па развіцці лічбавай эканомікі пры Савеце Міністраў Беларусі Алег КАНДРАЦЕНКА.**

Максімальна хуткія электронныя плацяжы, даступныя банкаўскія прадукты, лёгкія ў выкарыстанні і бяспечныя сэрвісы — гэта тое, да чаго сёння імкнецца любы банк. «На стыку банкаўскай дзейнасці і фінансавых тэхналогій нараджаюцца абсалютна новыя ўнікальныя прадукты. Выкарыстоўвайце іх, бо яны дазваляюць эканоміць вашыя рэсурсы, ваш час і вашы грашовыя сродкі», — адзначыў **Андрэй САКІРКА, намеснік старшыні Праўлення ААТ «Белінвестбанк».**

Экасістэма, якую стварае банк у рамках сэрвісу «Аплаці», унікальная для беларускага рынку. У вашым смартфоне замест мноства мабільных праграм можа быць адна, якая дазваляе распараджацца ўласнымі фінансамі без камісій і дадатковых пераплат, адначасова мець зносіны, як у звычайным месенджары і карыстацца рознымі дадатковымі паслугамі і сэрвісамі. Дадзеная паслуга даступна сёння любому жыхару Беларусі незалежна ад таго, кліентам якога банка ён з'яўляецца. Усе магчымасці сэрвісу бясплатныя для фізічных асоб. «А для бізнесу — гэта спосаб істотна эканоміць на эквайрынгу і тэрмінальным абсталяванні», — зрабіла сваю экспертную ацэнку прадстаўнік Нацбанка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# КАСТЫНГІ СКОНЧАНЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У мінулыя выхадныя завяршыліся апошнія — мінскія — кастынгі, куды, зрэшты, прыехалі некалькі дзясяткаў дзяўчат з іншых рэгіёнаў, якія з розных прычын не змаглі прайсці адбор бліжэй да дома. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на адборах і прыйшлі да высновы, што журы сёлета будзе як ніколі цяжка выбраць пераможцу.

## ХТО НА НОВЕНЬКУЮ

— Не ведаю, як я наогул тут апынулася, бо сёння ў мяне яшчэ два эфіры: я карэспандэнт «Нашых навін» на тэлеканале АНТ, і я спадзяюся паспець на абодва выпускі навін, — ашаламіла адборачную камісію Маргарыта Навуменка.

— Хачу вас расчараваць, але вы праходзіце ў наступны этап — дэфіле ў купальніках, — здзівілі дзяўчыну і суддзі.

...Прэтэндэнткі прыходзяць да дзвярэй Нацыянальнай школы прыгажосці ў поўнай гатоўнасці: туфлі на абцасах, купальнікі, у многіх — немалыя партфолія, абавязкова гумка ці заколка, каб сабраць валасы. А вось макіяж пад забаронай, і тых, хто не звярнуў увагі на гэта патрабаванне, адпраўляюць умывацца.

Але прывабная знешнасць — нават не палова справы, каб звярнуць на сябе ўвагу. Адной з перашкод становіцца рост — у кагосьці ён нават меншы за 170 сантыметраў, тады суддзі ўдакладняюць узрост удзельніцы: калі дзяўчыне 18 гадоў, то пытанне пары сантыметраў можа вырашыцца за два гады да наступнага конкурсу, а вось у 24 так проста ўжо не вырасці... Некаторых папярэджваюць, што да сярэдзіны сакавіка трэба будзе ўзяць сябе ў рукі і пахудзець (у мінулыя гады дзеля запаветнай мэты дзяўчаты скідвалі па 10, а некаторыя і больш чым 20 кілаграмаў!), але ёсць і адваротныя рэкамендацыі. Прычым, заўважае **кіраўнік мадэльнага агенцтва Тамара ГАНЧАРОВА,** паправіцца часам бывае цяжэй, чым скінуць вагу: «Трэба не проста ісці і есці булкі, а наладзіць харчаванне, рушыць у спортзал і займацца з трэнерам — працы тут шмат».

І канешне, за «абгорткай» павінен быць цікавы змест, таму дзяўчаты гатовыя спяваць, танчыць, чытаць вершы, адціскацца і садзіцца на шпагат, пачаставаць смакатой уласнага прыгатавання і паказаць свае мастацкія работы... Кандыдатак, якія не могуць расказаць пра свае захапленні і дасягненні па-за вучобай ці работай, у лоб пытаюць: "Што карысната вы робіце для краіны, акрамя мадэлінгу? А што можаце зрабіць? Кім бачыце сябе праз тры, пяць гадоў? Навошта вам конкурс «Міс Беларусь», калі вы — ідэальны кандыдат, каб стаць чыёйсьці «місіс»? І не, гэта не сексізм, а сучасны трэнд — на конкурсе «Міс свету», нагадаем, вось ужо 25 гадоў дзейнічае лозунг «Прыгажосць з мэтай», а ўдзельніцы не толькі дэфілююць у прыгожых сукенках і пазіруюць у фотасесіях, але ўдзельнічаюць у самых розных дабрачынных ініцыятывах ва ўсім свеце. І тут нашы дзяўчаты, трэба заўважыць, калі не напярэдадні планеты ўсёй, то ў тэме і ў справе — многія з іх працуюць валанцёрамі ці іншым чынам удзельнічаюць у дабрачыннасці: дапамагаюць сем'ям, дзе ёсць дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, праводзяць трэніроўкі для малых з ДЦП, распрацоўваюць курсы арт-тэрапіі і г. д.



## КАШТОЎНАЕ Ў МОДЗЕ

— У Мінску дзяўчаты больш падрыхтаваныя, чым у рэгіёнах, — дзеліцца ўражаннямі ад першага дня сталічнага кастынгу **кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў АНТ Алена ЛОБАЧ.** — Яны пaглядзелі анлайн-трансляцыі з абласцей і ведаюць, пра што мы звычайна распытваем, таму адразу выдаюць маналог з усімі звесткамі пра сябе, іх цяжэй паставіць у няёмкае становішча, хоць мы і стараемся



часам збянтэжыць, каб прымусіць раскрыцца. Яны дэманструюць свае таленты напоўніцу: ім не лянiва расказаць пра свае заслугі ў той ці іншай галіне, прынесці медалі, калі гэта спартсменкі, альбо музычныя інструменты, калі дзяўчаты творчыя. Адзначу тэндэнцыю, якая мяне асабіста ўразіла: стала модна тое, што каштоўна. Калі да нас прыходзіць дзяўчына, прыносіць уласнаручна вышытыя рушнікі і дэталёва, прафесійна разбіраецца ў тым, што значыць кожны колер і кожны сімвал, калі дзяўчына без усякай мастацкай адукацыі робіць фрэскі на аснове карцін Манэ — і іх заўважаюць у тым ліку за мяжой, у Італіі, у Іспаніі, калі прыходзяць моцныя вакалісткі — «народніцы», «эстрадніцы», акадэмічны вакал, — то іхняя прыгажосць больш напоўненая і змястоўная. Наогул даўно хацелася адцягнуць увагу гледачоў ад дэфіле ў купальніках і расказаць цікавыя гісторыі, паказаць глыбокі змест за прыгожай абалонкай — вельмі радуе, што гэта разумеюць і самі ўдзельніцы. Радуе перавага натуральнай прыгажосці: нашы дзяўчаты перасталі нарошчваць валасы, напампоўваць вусны, перарабляць насы — я не ўбачыла на кастынгах нікога, хто б зрабіў з сабой нешта штучнае.

Сярод удзельніц адбораў як ніколі шмат урачоў розных спецыяльнасцяў: тэрапеўты, стаматолагі, урачы агульнай практыкі, хірургі, педыятры, эпідэміёлагі... Наогул прафесійная палітра вельмі шырокая: аграномы, будаўнікі, педагогі, эканамісты, інжынеры-праграмісты, актрысы, повары, юрысты, трэнеры, выратавальнікі, вайскоўцы — і ўсе, як на падбор, харызматычныя і прывабныя. А чаго вартая гісторыя Алены Касаткінай з Драгічына — дзяўчына працуе дворнікам, займаецца дзюдо і тэквандо і марыць навучыцца... валіць лес! У Гродне адна з прыгажунь выканала на балалайцы славуты хіт «Дэспасіта». Мінчанкі ўражваюць журы выдатнай французскай мовай, даюць экспрэс-урокі харвацкай, італьянскай, іспанскай... «Хочацца расказаць у эфіры як мага больш такіх жыццёвых гісторый, якія паказваюць і харaство, і сілу, моцны характар беларускіх дзяўчат», — кажуць тэлевізійнікі.

## ПРОСТАЯ МОВА

Арганізатары ўжо прааналізавалі відэаматэрыял, зняты ў абласцях (амаль 50 гадзін запісу), дэталёва разгледзелі анкеты і фота, каб вызначыць тых, хто трапіць у наступны этап — топ-100. Але, каб не прапусціць ніводнай прыгажуні, камісія збярэцца яшчэ раз у пашыраным складзе і абмяркуе кожную магчымую ўдзельніцу. Паўфінал конкурсу «Міс Беларусь» адбудзецца 21 сакавіка ў Нацыянальнай школе прыгажосці, пасля яго журы вызначыць 30 фіналістак, якія трапяць у заключны, тэлевізійны этап праекта. Маштабны фінал, для якога наноў шыюцца арыгінальныя ўборы і прыдумляюцца дэкарацыі, якія перададуць нацыянальны характар конкурсу, адбудзецца ў Мінску 15 мая.

Але да фіналу яшчэ далёка, а пакуль зaўважаем у журы **«Міс Беларусь — 2018» і «Міс Свету Еўропа» Марыю ВАСІЛЕВІЧ,** у якой цікавімся:

— Ці змяніліся дзяўчаты ў параўнанні з 2018-м?

— Усе такія ж прыгожыя, і абстаноўка такая ж сяброўская, — смяецца Марыя. — Вельмі многа тых, хто ўразіў сваімі хобі і гісторыямі — напрыклад, мне запомнілася дзяўчына, якая дапамагала рэабілітаваць свайго шасцігадовага брата пасля інсульту, а цяпер хоча дапамагаць іншым дзеткам з гэтай хваробай... Мой дабрачынны праект з дзіцячымі дамамі таксама працягваецца і разрастаецца, да яго далучаюцца новыя ўстановы, і я вельмі рада, што дзякуючы конкурсу прыгажосці і той магчымасці, якая мне выпала два гады таму, удаецца прыцягваць усё больш увагі да тэмы дабрачыннасці.

— З улікам уласнага вопыту што параіце тым шчасліўцам, хто трапіць у топ-100 і фінальную трыццатку ўдзельніц?

— Самае галоўнае — адказна паставіцца да справы і штодня выкладвацца па максімуме. Бо трапіць на нацыянальны конкурс прыгажосці — вялікая ўдача, і калі яна вам выпала, трэба ўчапіцца за гэту магчымасць і выкарыстоўваць яе напоўніцу, не адкладваць на заўтра нічога, што вы можаце зрабіць сёння.

...Нагадаем, конкурс «Міс Беларусь» пройдзе ўжо дванаццаты раз. Найбольшую колькасць перамог у ім мае Гродзеншчына (тры ранейшыя каралевы прыгажосці родам адсюль), па дзве кароны — у Брэсцкай, Магілёўскай, Віцебскай вобласці і ў Мінска. Каму пашанцуе сёлета?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**



Класныя навіны

# Асноўныя памылкі маладых,

## або Каб не расчаравацца ў прафесіі

**Цікава, чаго баяцца маладыя настаўнікі? Што вучні не будуць успрымаць іх усур'ёз? Аказацца з дзецьмі на розных хвалях? А можа быць, яны баяцца неадэкватных кіраўнікоў і негатыўнага стаўлення да іх старэйшых калег?**

Можна скончыць універсітэт з «чырвоным дыпломам», магістратуру і нават аспірантуру, але гэта яшчэ не гарантыя таго, што ты прыйдзеш у дзіцячую аўдыторыю і ўсё пойдзе як па масле... Адаптацыя ў настаўніцкім асяродку — задача не аднаго дня. І настаўніца рускай мовы і літаратуры Анастасія Ганчарова добра ведае гэта з уласнага досведу. Калісьці яна, з'яўляючыся магістрам педагагічных навук, баялася паказацца некампетэнтнай, і хоць у яе ўзнікала шмат пытанняў штодня, не адважвалася калегам у гэтым прызнацца. Проста сядзела і псавала класны журнал...

— Маладыя ўсур'ёз апасаюцца ціску на іх з боку вучняў, баяцца страціць аўтарытэт, перайсці мяжу «настаўнік-сябар», не знайсці падыход да «асаблівых дзяцей», прымусіць вучняў думаць шаблонна, зламаць іх, укласці ў іх свае думкі— пералічвае Анастасія.

Два гады таму яна запусціла ютуб-канал #ШчасцеНавучаць, дзе давала парады маладым калегам, каб яны не наступалі на тыя ж граблі. А наступным крокам для яе стане «Школа маладога настаўніка».

— Я вырашыла перанесці нашы сустрэчы з анлайн у афлайн, — кажа настаўніца, — бо некаторыя пытанні можна абмяркоўваць толькі ў жывым фармаце. А іх, як я пераконваюся, у маладых педагогаў менш не становіцца. «Школа маладога настаўніка» — гэта цыкл рэгулярных сустрэч, у рамках якіх студэнты выпускных курсаў педагагічных спецыяльнасцяў і настаўнікі-пачаткоўцы змогуць атрымаць ад мяне прафесійную, метадычную і псіхалагічную дапамогу. Якія тэмы будзем абмяркоўваць? Асноўныя памылкі маладых настаўнікаў: як іх пазбегнуць? Дысцыпліна без стрэсу і згуртаванне калектыву. Патрабаванні да правядзення сучаснага ўрока, лічбавыя інструменты ў рабоце настаўніка, складанне канспекта эфектыўных заняткаў. Як правесці першы бацькоўскі сход ці, напрыклад, нестандартны сход з бацькамі? У цэнтры нашай увагі абавязкова будзе эфектыўнае ўзаемадзеянне маладога настаўніка з адміністрацыяй і калегамі... Як папярэдзіць эмацыянальнае выгаранне? Дзе і навошта развівацца прафесійна? Як падрыхтавацца да адкрытых і конкурсных урокаў?

Запланаваныя і практычныя заняткі, у рамках якіх малады настаўнік паспрабуе правесці паўнавартасны ўрок з наступным яго разборам і аналізам.

Увогуле праграма будзе вельмі мабільнай і гнуткай — у залежнасці ад канкрэтных запытаў педагогаў (частата сустрэч — раз на два тыдні да канца навучальнага года). Працаваць будзем у камернай абстаноўцы — у групах па 10 чалавек. Збіраюся прыцягваць і сваіх калег (псіхолагаў, коўчаў), гатовых падзяліцца з маладымі каштоўным досведам. Таму калі вы малады настаўнік ці толькі плануеце ім стаць, чакаю вас на прэзентацыі Школы, якая адбудзецца 25 лютага (рэгістрацыя па спасылцы https://docs.google.com/forms/d/e/1FAIpQLSecQGkP3Z9mL0E-XEMj7ITnjiZDvhi1l8A3chArWDJvIxD8fw/viewform). Увогуле, маладым трэба абавязкова падтрымліваць стасункі з калегамі: калі ты будзеш адкрыты да людзей, то ўсё пачне ў цябе атрымлівацца. Лепш прыслухацца да парады і паглядзець, што з гэтага атрымаецца, чым праігнараваць і атрымаць уласны досвед цаной проб і памылак.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже изолированного помещения

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк».

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27638, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, Серяжский с/с, д. Лучники, ул. Юбилейная, 10, общей площадью 79,2 кв. м |
| **Начальная цена продажи** | 20980,08 руб. (двадцать тысяч девятьсот восемьдесят рублей 08 копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1049,0 (одна тысяча сорок девять) бел. руб. |
| **Открытый аукцион состоится** | 23.03.2020 в 10.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, комната переговоров |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 16.30, в пятницу – до 15.45 по 19.03.2020 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 112 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефону 8 (017) 279-48-24 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 1049,0 бел. руб. на счет № BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 20 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона

## Извещение о созыве общего собрания акционеров

**Уважаемые акционеры ОАО «Универмаг «Солигорск»!**

**27 марта 2020 года состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Универмаг «Солигорск», расположенного по адресу: 223710, Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 39. Собрание пройдет по адресу: г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4-й этаж, актовый зал**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и об основных направлениях деятельности общества в 2020 году.
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества за 2019 год.
3. Отчет о работе ревизионной комиссии Общества за 2019 год. Заключение по результатам проведенной ревизии финансово-хозяйственной деятельности Общества по годовому отчету, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2019 год с учетом аудиторского заключения.
5. Утверждение распределения и использования чистой прибыли Общества за 2019 год.
6. Утверждение направлений и нормативов распределения и использования чистой прибыли Общества на 2020 год.
7. Утверждение размера, порядка, и сроков выплаты дивидендов за 2019 год.
8. Периодичность выплаты дивидендов за 2020 год.
9. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
10. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
11. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, в том числе с информацией о деятельности общества за отчетный период, можно ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4-й этаж, планово-экономический отдел с 6 марта по 26 марта 2020 года в рабочие дни (время работы с 8.00 до 17.00) либо 27 марта 2020 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 27 марта 2020 года в 14.00.**

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на **2 марта 2020 года.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**

**акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

Наблюдательный совет.

УНН 600024725

*Акционерам ОАО «Белбуд»*

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении очередного общего собрания акционеров ОАО «Белбуд»

Уважаемые акционеры!

Открытое акционерное общество «Белбуд», расположенное по адресу: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров в очной форме.

**Собрание состоится 19.03.2020 в 15.00** по адресу: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, конференц-зал.

Регистрация участников производится по месту проведения собрания 19.03.2020 с 14.30 до 14.50 на основании списка лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ

**1.** Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2019 году и основных направлениях развития Общества на 2020 год.

**2.** Утверждение заключений аудиторской и ревизорской проверок финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год.

**3.** Утверждение годового бухгалтерского баланса и отчета о прибыли и убытках Общества за 2019 год.

**4.** Утверждение источников покрытия убытков за 2019 год и утверждение использования прибыли на 2020 год.

**5.** Определение рекомендуемого размера вознаграждения и компенсаций расходов членам Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.

**6.** Избрание членов Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии.

Для регистрации необходимо иметь при себе: паспорт, представителю акционера – доверенность и паспорт.

Лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться с документами, подготовленными к собранию, с 09.03.2020 (понедельник–четверг – с 8.30 до 17.00, пятница – с 8.30 до 16.00, обед с 13.00 до 13.20)) по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис № 1 (в приемной генерального директора), а в день проведения Собрания – по месту его проведения.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 16.03.2020.

**Телефон для справок – 8017 237 29 50.**

УНП 100794022

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Агро-сад Рассвет»

**Предмет торгов: лот –** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-55337 (наименование: здание; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 623,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Чернавчицкий с/с, 31, 0,1 км, западнее д. Несвило, здание, на земельном участке с кадастровым номером 121284600001000048, площадью 0,3644 га

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без НДС)** | 16 384,00 | **Размер задатка, руб.** | 1638,40 |
| **Продавец** | ОАО «Агро-сад Рассвет», Брестская обл., аг. Вистычи, ул. Центральная, 22 , УНП 200035041 | | |
| **Организатор аукциона** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Информация о возмещении затрат** | Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона | | |

**Аукцион состоится 3 марта 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 2 марта 2020 г. до 17.00**

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Агро-сад Рассвет» размещено в газете «Звязда» от 03.12.2019 г.

**ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИМУЩЕСТВА ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 13

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость права аренды, бел. руб. с учетом НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Торговый павильон (летнее кафе) общей площадью 12,0 кв. м, расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 30. Цель использования: для оказания услуг, для организации торговли непродовольственными товарами. Срок договора аренды 2 года, арендная плата в месяц 486,72 руб. с учетом НДС 20 % | 121,68 руб. | 12,17 руб. |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **по 27 февраля 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2–1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **2 марта 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2–1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 18.02.2020 г. |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 10 %. Заключить договор аренды в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-10007 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом), площадью 37,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Парковая, 2

ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422050400002001488 (назначение – для обслуживания одноквартирного жилого дома), площадью 0,0951 га по адресу: г. Скидель, ул. Парковая, 2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0031 га; земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадью 0,0951

**Начальная цена продажи – 1550 руб.** (тысяча пятьсот пятьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 155 руб. (сто пятьдесят пять рублей)

**Продавец** – ОАО «Агрокомбинат «Скидельский», Филиал «Скидельский», 231761, г. Скидель, ул. Кизевича, 36, тел./факс 8-0152-97-78-92

**Организатор торгов** – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – возмещение Победителем аукциона средств, затраченных на изготовление правоустанавливающих документов в размере 1347,97 руб. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 2 марта 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3–209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 25 февраля 2020 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 марта 2020 года проводит 5-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 45 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. XTC431000J0051760 с кузовом-фургоном К2. 4320 № б/н 1988 г. *11 359 км* | г. Молодечно, в/ч 04152 | 10 400,00 | 2080,00 |
| 46 | Грузовой бортовой КамАЗ-43106 ш. XTC431060L0005418 1990 г. *104 847 км* | г. Молодечно, в/ч 04152 | 9700,00 | 1940,00 |
| 47 | Грузовой УРАЛ-375АМ ш. 418649 с кузовом-фургоном К1.375 № 02188 1984 г. *1130 км* | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2720,00 |
| 48 | Грузовой УРАЛ-375АМ ш. 430856 с кузовом-фургоном К1.375 № 11145 1984 г. *1130 км* | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2720,00 |
| 49 | Грузовой УРАЛ-375АМ ш. 428223 с кузовом-фургоном К1.375 № 09147 1984 г. *1091 км* | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2720,00 |
| 50 | Грузовой УРАЛ-375АМ ш. 435252 с кузовом-фургоном К1.375 № 04370 1985 г. *1086 км* | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2720,00 |
| 51 | Грузовой УРАЛ-375АМ ш. 435779 с кузовом-фургоном К1.375 № 05285 1985 г. *1116 км* | г. Молодечно, в/ч 04152 | 13 600,00 | 2720,00 |
| 52 | Специальный автомобиль Урал-43203-01 с кузовом фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 09197 1982 г. *4 кат.* Автошасси Урал-43203-01 ш. 132343 дв. 456225 1982 г. *4 кат. 28 536 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8400,00 | 1680,00 |
| 53 | Специальный автомобиль Урал-43203-1012 с кузовом-фургоном К1-4320 в составе: кузов-фургон К1-4320 № 08592 1989 г. *4 кат.* Автошасси Урал-43203-1012 ш. 127667 дв. 415532 1989 г. *4 кат. 6326 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8400,00 | 1680,00 |
| 54 | Специальный автомобиль КамАЗ-43101 с кузовом-фургоном КБ1-4320Д в составе: Кузов-фургон КБ1-4320Д № 09230 1990 г. *4 кат.* Автошасси КамАЗ-43101 ш. 0020666 дв. 0672656 1990 г. *4 кат. 618 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8500,00 | 1700,00 |
| 55 | Автошасси ГАЗ-66-11 ш. 0661998 дв. 90216-91 1991 г. *4 кат. 2057 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 3000,00 | 600,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **26 марта 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 23 марта 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **26 марта 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662, корреспондент-Сбербанк России, г. Москва, № коррсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, **без НДС**. **Справки по тел./факс: (017) 398 05 41**

Кампетэнтна

# СМС-папярэджанні і «зніжкі» на штрафы

## Міністр юстыцыі расказаў пра планы ведамства

**Шматфункцыянальныя цэнтры па аказанні адміністрацыйных паслуг з'явяцца ў Мінску, Магілёве і Шчучыне, а ў інтэрнэце створаць асабістыя кабінеты даўжніка і спагнанніка доўгу. У прыярытэце таксама пераход ад папяровага фармату дакументаў да электроннага. Грамадзянам дазволяць весці аўдыя- і відэазапіс у органах прымусовага выканання, а адміністрацыйныя правапарушэнні, магчыма, падзеляць на тры катэгорыі. Пра гэтыя і іншыя планы Мінюста расказаў міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.**



### Асабістыя кабінеты для даўжніка і спагнальніка

Летась органамі прымусовага выканання ўзбуджана 2,33 мільёна выканаўчых вытворчасцяў. За год спагнана 1,44 мільярда рублёў, у даход дзяржавы — 95 мільёнаў. Знізіўся астатак нявыкананых вытворчасцяў — цяпер іх крыху больш за мільён, удакладніў міністр:

— Асаблівую ўвагу сёлета ўдзелім тым катэгорыям спраў, якія знаходзяцца на выкананні больш за год. Тут патрабуюцца дадатковыя намаганні па спагнанні даўгоў.

У 2019-м Мінюст апрабаваў аўтаматычную рассылку даўжнікам СМС-паведамленняў пра наяўнасць узбуджанай супраць іх выканаўчай вытворчасці. Дзякуючы гэтаму больш за 20 % запазычанасцяў былі пагашаны адразу.

Інтэграцыя інфармацыйнай сістэмы прымусовага выканання з АРІП таксама станоўча адбілася на вяртанні грошай, бо доўг стала магчымым аплаціць, не прыходзячы асабіста да судовага выканаўцы.

Дзякуючы інфармацыйнаму супрацоўніцтву з Нацыянальным банкам, у Мінюста з'явіўся доступ да звестак пра рахункі і электронныя кашалькі даўжнікоў. А да рэестра даўжнікоў на партале ведамства летась звярнуліся 280 мільёнаў разоў.

Сёлета плануецца стварыць асабістыя кабінеты бакоў выканаўчай вытворчасці. Даўжнік і спагнальнік змогуць самастойна сачыць за выкананнем працэсу. Тым самым павысіцца інфармаванасць бакоў і дадатковы кантроль работы органаў прымусовага выканання.

— У найбліжэйшы час плануем падпісаць загад, згодна з якім ва ўсіх органах прымусовага выканання грамадзянам дазволяць весці аўдыя- і відэазапісы сустрэчы з прадстаўнікамі органаў прымусовага выканання ці працэсу здзяйснення выканаўчага дзеяння, не пытаючыся дазволу на гэта ў службовых асоб, — падзяліўся Алег Сліжэўскі. — Гэта павысіць давер ва ўзаемаадносінах паміж бакамі, а таксама стане прафілактычнай мерай па папярэджанні магчымых карупцыйных правапарушэнняў.

### Натарыусы, рыэлтары, стымулы

Падрыхтаваны і знаходзіцца ў Палаце прадстаўнікоў законапраект, які карэкціруе закон аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці. Калі прапановы будуць зацверджаны, то ў кампетэнцыі натарыята з'явіцца магчымасць прастаўлення апастыля на дакументы большасці дзяржаўных органаў (пакуль гэта могуць рабіць толькі самі органы) за выключэннем сферы адукацыі. Сёння для легалізацыі дакумента трэба прыехаць у сталіцу ці абласны цэнтр у пэўнае ведамства. Калі прапановы адобраць, гэта можна будзе зрабіць на месцы (у краіне 835 натарыусаў), удакладніў міністр.

Яшчэ адзін пакуль не прыняты законапраект датычыцца дзейнасці рыэлтараў. Адна з яго прапаноў — заканадаўчая забарона збірання платы за адну і тую ж паслугу з пакупніка і прадаўца — рабіць гэта павінен хтосьці адзін. Настойваюць у Мінюсце і на адмене дзяржаўнага рэгулявання тарыфаў на рыэлтарскія паслугі пры здзелках з нежылой нерухомасцю і паміж юрыдычнымі асобамі. Тарыфы на здзелкі з жыллём для людзей, як і раней, будуць рэгулявацца.

— Кошт жылля і так досыць высокі, таму цана паслуг мае істотнае значэнне. Калі поўнасцю адмяніць дзяржрэгуляванне тарыфаў па здзелках з жыллём з удзелам грамадзян, гэта можа прывесці да росту кошту рыэлтарскіх паслуг, — патлумачыў міністр.

Падрыхтаваны таксама прапановы па карэкціроўцы Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, сярод якіх змяненне катэгарызацыі адміністрацыйных парушэнняў. За правіннасць, якая не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, прадугледжваецца папярэджанне, заўвага ці штраф да 10 базавых велічынь. Як толькі асобу падверглі аднаму з такіх пакаранняў, адразу лічыцца, што яна не прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці. Пасля значнага правапарушэння чалавек лічыцца прыцягнутым да адказнасці цягам паўгода, пасля грубага — года.

— Разглядаецца таксама пытанне выкарыстання стымулюючых так званых зніжак на памеры штрафу. За несвоечасовую аплату штрафу яго памер можна павялічыць. Калі ж чалавек выплаціў штраф адразу ці ў вызначаны тэрмін, то мы прапануем аплачваць не 100 % гэтага штрафу, а, скажам, 25 ці 50 %. Аднак усё гэта яшчэ будуць абмяркоўваць, шукаць кампраміс, — дадаў кіраўнік Мінюста.

Суд

# Псіхалагічны тэст для суддзяў і відэазапіс пасяджэння

**Адзіная інфармацыйная сістэма судоў агульнай юрысдыкцыі (АІССАЮ) пачне сваю работу ў краіне напрыканцы гэтага года, а да канца 2021-га неабходна завяршыць працу над адзіным грамадзянскім працэсуальным кодэксам. Налета павінен таксама з'явіцца агульнадаступны электронны банк судовых рашэнняў. Пра гэтыя і іншыя навааўвядзенні судовай сістэмы расказаў Валерый КАЛІНКОВІЧ, першы намеснік старшыні Вярхоўнага суда.**




Адна з галоўных задач судовай сістэмы — умацаванне кадравага складу і патэнцыялу судзейскага корпусу і прыцягненне ў іх рады найбольш прыстойных членаў юрыдычнай супольнасці. Для гэтага сёлета дзейнічае абноўленая сістэма крытэрыяў падбору кадраў на пасады суддзяў, якая суправаджаецца абавязковым псіхалагічным тэстам. Заховўаецца і сур'ёзная праверка прававых ведаў. Дарэчы, палова кандыдатаў, якія пажадалі летась здаць экзамен, не прайшлі праверку, падзяліўся Валерый Калінковіч.

— Мы ўважліва аналізуем, як адгукаецца ў грамадстве работа судоў. Арганізацыя, эфектыўнасць і справядлівасць правасуддзя — трыяда, якая ў грамадскай свядомасці характарызуе якасць судовай дзейнасці. У гэтым кантэксце мы і ацэньваем сёння дзейнасць кожнага работніка ў нашай сістэме.

Суды арыентуюць таксама на разумнае выкарыстанне альтэрнатыў грамадскай і крымінальнай адказнасці, у тым ліку медыяцыйныя працэдуры і стымуляванне дзейнага раскаяння.

Летась у сувязі з прымірэннем з пацярпелым было спынена 706 спраў. Частка з іх — справы аб злачынствах так званага прыватнага абвінавачвання, дзе магчымасць прымірыцца абвінавачанаму і пацярпеламу наўпрост прапісана ў Крымінальным кодэксе і з'яўляецца для суда абавязковай прычынай для спынення справы.

— Медыяцыйныя сесіі найчасцей прымяняюцца ў эканамічным судаводстве. Аднак паступова не толькі суб'екты гаспадарання, але і грамадзяне ўсё часцей звяртаюцца да гэтай працэдуры. Мы не выключаем укараненне медыяцыі і ў крымінальны працэс, — мяркуе спецыяліст. — У пэўнай ступені людзей стрымлівае кошт паслуг медыятара, які сёння досыць істотны. Суды расказваюць пра магчымасць скарыстацца па ўзаемнай згодзе медыяцыйнымі працэдурамі. Часам у ролі такіх пераможцаў выступаюць абароны абвінавачаных. Калі за гэтым няма ніякай крамолы, то гэта нармальна. Пытанне не ў лічбавых паказчыках, а ў вырашэнні канфлікту, праз які людзі апынуліся ў судзе.

Яшчэ адзін напрамак працы ў плане пашырэння магчымасцяў доступу да правасуддзя, яго разумнай эканамічнасці і адкрытасці судовай сістэмы ў ведамстве бачаць праз укараненне ў сістэму сучасных інфармацыйных тэхналогій і, як следства, спрашчэнне судовых працэдур. Прынамсі, гэта датычыцца законапраекта, які дазволіць перайсці ад складання падрабязных папяровых пратаколаў у судзе да аўдыя- і відэафіксацый працэсу практычна ва ўсіх відах судавытворчасці.

— Спадзяёмся, што ён будзе прыняты на вясновай сесіі парламента і мы пачнём яго практычна рэалізоўваць. Восенню мы павінны скончыць забеспячэнне сродкамі аўдыя- і відэафіксацыі ўсе абласныя суды. У Вярхоўным судзе і ў шэрагу раённых такія сістэмы ўжо існуюць, — заўважыў намеснік старшыні суда.

Інфармацыйная сістэма АІССАЮ, якая павінна запрацаваць сёлета, дазволіць больш аператыўна атрымліваць інфармацыю пра правасуддзе і павінна значна пашырыць магчымасці для дыстанцыйнага звароту ў суд праз сеціва. У сваю чаргу, гэта дазволіць удзельнікам працэсу аператыўна атрымліваць інфармацыю пра ход справы.

На гэты год запланавана і распрацоўка канцэпцыі законапраекта аб доступе да інфармацыі аб дзейнасці судоў агульнай юрысдыкцыі. Валерый Калінковіч падкрэсліў неабходнасць заканадаўчага ўпарадкавання работы з інфармацыяй, якая датычыцца судовай дзейнасці:

— Законапраект дазваляе ў межах аднаго нарматыўна-прававога акта сканцэнтраваць усе асноўныя патрабаванні, якіх неабходна прытрымлівацца пры рабоце з такой адчувальнай інфармацыяй, як вынікі разгляду канкрэтных спраў. Мы працуем з людзьмі, якія таксама маюць права на асабістае жыццё і разумнае захаванне яго таямніцы.

Адно з пытанняў, якое будзе рэгулявацца гэтым законам, — магчымасць трансляцыі адкрытых судовых пасяджэнняў у інтэрнэце. Дзякуючы такому стрыму могуць не вытрымлівацца пэўныя судовыя каноны, калі сведка, які чакае сваёй чаргі, спакойна назірае за тым, што адбываецца ў зале пасяджэння, што недапушчальна.

У аб'ёмны электронны банк судовых рашэнняў, які запрацуе ў 2021-м, будуць змяшчаць рашэнні, што выносяцца ва ўсіх відах судавытворчасці пры захаванні патрабаванняў заканадаўства на ахову персанальных дадзеных удзельнікаў працэсу.

— Гэта патрабуе стварэння досыць складанага дадатковага праграмнага прадукту. Сумесна з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі мы працуем над тым, каб, публікуючы прававы складнік спраў, не дапусціць распаўсюджвання інфармацыі пра прыватнае жыццё ўдзельнікаў працэсу ў межах, больш за тыя, што вызначаны законам, — удакладніў Валерый Калінковіч.

Прававая гасцёўня

# Крамы павінны працаваць да апошняга пакупніка

***На днях хацела заскочыць па малако ў краму, да закрыцця якой заставалася пяць хвілін. Аднак ахоўнік на ўваходзе не пусціў мяне, матывуючы гэта тым, што я не паспею зрабіць пакупкі да заканчэння работы магазіна. Ці меў ён права на такія дзеянні?***

***Лілія П., г. Мінск.***



На пытанне адказвае **Вікторыя ЧАМЯРЭЎСКАЯ, вядучы спецыяліст упраўлення прававога рэгулявання бюджэтна-фінансавых зносін і падаткаабкладання Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Ахоўнік не меў права не пусціць вас у краму. Нават калі да канца яе работы заставалася б адна хвіліна, ён не павінен быў перашкаджаць вам наведаць яе. Уваход у магазін перапыняецца роўна ў час афіцыйнага заканчэння яго работы.

У адпаведнасці з Правіламі продажу асобных відаў тавараў і ажыццяўлення грамадскага харчавання забараняецца перапыняць пакупнікам доступ у гандлёвую залу з набліжэннем часу завяршэння работы прадаўца. За дзесяць хвілін да завяршэння работы прадавец можа папярэдзіць пакупнікоў, што час іх абслугоўвання заканчваецца ў сувязі з набліжэннем часу завяршэння работы крамы адпаведна рэжыму работы ўстановы.

Аднак усе пакупнікі, якія ўжо знаходзяцца ў зале, павінны быць абслужаны і разлічаны, нават калі гэта адбываецца ўжо пасля афіцыйнага завяршэння работы магазіна. Канешне, гэта не азначае, што, трапіўшы ў краму за хвіліну да канца яе працы, вы пойдзеце гадзіну гуляць па радах з каляскай. Акрамя заканадаўчых правоў трэба кіравацца таксама чалавечымі адносінамі адзін да аднаго.

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць на іх адказы.***

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

Статус для спадчыны

# Хлеб як культурная каштоўнасць

**На мінулым тыдні ў Міністэрстве культуры Беларусі адбылося чарговае пасяджэнне рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны.**

Эксперты разгледзелі прапановы розных рэгіёнаў аб уключэнні ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў чатырох нематэрыяльных праяў творчасці чалавека: беларускія мастацкія практыкі саломапляцення, традыцыі інсітнага (наіўнага) мастацтва Віцебшчыны, традыцыі выпякання грачанага хлеба (на тэрыторыі Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці) і тэхналогіі ды традыцыі выпякання хатняга хлеба на Міншчыне (захоўваецца ў вёсках Жораўка і Кузьмічы Любанскага раёна). На сайце ўстановы афіцыйна паведамляецца, што па ўсіх прапановах навукова-метадычная рада прыняла станоўчыя рашэнні.



Фота kultura.by

Дарэчы, за 2019 год рэспубліканскі спіс папоўніўся 16 новымі аб'ектамі культурнай спадчыны, а ўсяго на дадзены момант у ім налічваецца амаль 5,5 тысячы аб'ектаў. У снежні ж, нагадаем, адзін з беларускіх абрадаў — «Юраўскі карагод» — быў уключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Сёлета магчыма наданне адпаведнага высокага статусу традыцыі лясного бортніцтва Беларусі і Польшчы — падрыхтоўка па гэтай намінацыі вядзецца сумесна з польскім бокам.

# Захаваць і распаўсюдзіць

## Машына часу ў Белавежскай пушчы

Другую чаргу ўнікальнага археалагічнага музея пад адкрытым небам плануецца адкрыць сёлета на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Белавежская пушча», блізу вёскі Каменюкі. Акурат на гэтай тэрыторыі, нагадвае **дырэктар Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ,** археолагі выявілі больш за 50 аб'ектаў каменнага, бронзавага і жалезнага веку, пацвердзіўшы, што на гэтай тэрыторыі ўжо некалькі тысяч гадоў таму жылі людзі.

Наогул ідэя стварэння ўнікальнага для нашай краіны археалагічнага музея ўзнікла яшчэ ў 2008-м, калі былі праведзены маштабныя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Белавежскай пушчы.

Першая частка скансена — «гарадзішча жалезнага веку», якое ўключае жылыя дамы, гаспадарчыя забудовы і сістэму ўмацаванняў паселішча, адкрылася для наведвальнікаў яшчэ летась. Цяпер на месцы археалагічнага помніка Каменюкі-3 узнаўляецца падворак II—V стагоддзя нашай эры, прычым гісторыкі хацелі б паказаць у межах музея разнастайнасць забудоў і гаспадарак розных рэгіёнаў Беларусі, з іх адметнымі асаблівасцямі. Наогул жа на плошчы амаль у 18 гектараў экспазіцыя прадставіць развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры заходніх рэгіёнаў Беларусі ад каменнага веку да Сярэднявечча.

— На наш погляд, праблема захавання гісторыка-культурнай спадчыны патрабуе таго, каб людзі, якія жывуць і ў Мінску, і ў іншых рэгіёнах нашай краіны, найперш ведалі, што знаходзіцца на іх тэрыторыі, таму мы надаём шмат увагі папулярызацыі гэтай спадчыны на рэгіянальным узроўні, — дадае Вячаслаў Даніловіч. — Штогод Інстытут гісторыі ладзіць больш 20 навуковых форумаў — канферэнцый, семінараў, круглых сталы, — значная частка якіх праходзіць менавіта ў рэгіёнах з удзелам навучэнцаў і школьнікаў, мясцовых краязнаўцаў, пры плённым узаемадзеянні з мясцовымі ўладамі. Асабліва гэтая праца актывізавалася ў сувязі з Годам малой радзімы. Па выніках гэтых канферэнцый разам з выдавецтвам «Беларуская навука» заснавана серыя «Беларусь праз прызму рэгіянальных гісторый», у якой ужо выйшла больш за 10 выданняў, што карыстаюцца вялікім попытам у адпаведных рэгіёнах.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Малая радзіма

# «ТУТ ЦЯГНЕ ЖЫЦЬ І КАХАЦІ...»

**...тут добра так, як нідзе, у старасвецкай хаце, у дзедаўскім родным гняздзе» — пісаў класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч пра дом у Рагачове, дзе ён працаваў над сваімі лепшымі творамі. «Гняздо» стаіць і сёння, у ім жыве дух пісьменніка. І, каб захаваць памяць, улады і жыхары горада мараць арганізаваць музей. А калі атрымаецца, то цэлую арт-пляцоўку.**



Дом, у якім плануюць стварыць музей.

Фота: Свабоднае слова.

Тэма яе стварэння актуальная ўжо некалькі дзесяткаў гадоў. І толькі летась сваякі пісьменніка нарэшце пайшлі на кантакт.

— У доме жывуць стрыечны брат з жонкай і сынам. Будынак прыходзіць у заняпад. Ні сродкаў, ні сіл на аднаўленне і ўтрыманне ў іх ужо няма, — патлумачыў **намеснік старшыні Рагачоўскага райвыканкама Павел БЯРЭЗІНСКІ.** — Цяпер яны згодны на іншае жыллё. Аднак, каб перавесці дом у камунальную ўласнасць, трэба належна афарміць неабходныя дакументы на дом, чым і займаемся цяпер, а пасля правесці рыначную ацэнку. Кошт дома і будзе падставай для выдзялення сродкаў. Пытанне стаіць на асабістым кантролі старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя Салаўя, і ўжо праз некалькі месяцаў трэба будзе агучыць справаздачу.

...Спачатку рагачоўскі дом належаў дзеду Уладзіміра Сямёнавіча, а потым перайшоў да дзядзькі пісьменніка, якога класік называў другім бацькам. Менавіта туды з вялікім задавальненнем прыязджаў Караткевіч, там яму і салодка працавалася, як нідзе. Яго ў любы час чакаў уласны пакой з двума вокнамі на вуліцу і двума ў сад.

— Набытыя ім самім стол, стул і кушэтка, а таксама некаторыя асабістыя рэчы захаваліся дагэтуль. Яны і складуць аснову першай экспазіцыі, — распавяла **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Наталля ПРУС.** — У іншым пакоі плануем арганізаваць адмысловую залу літаратараў. З Рагачовам жа звязаны лёсы шматлікіх пісьменнікаў. Гэта і Андрэй Макаёнак, і Міхась Лынькоў, і Алена Васілевіч, і яўрэйскі пісьменнік Самуіл Галкін і наш ганаровы грамадзянін, сучаснік Васіль Ткачоў. Таму там мы будзем ладзіць прысвечаныя ім выставы, канферэнцыі, сустрэчы з іншымі вядомымі людзьмі... Хочацца задзейнічаць і прысядзібны ўчастак. Магчыма, пабудуем амфітэатр. Тады гэтае месца стане сапраўднай арт-пляцоўкай.

Плануецца, што дом музей будзе адным з адметных пунктаў турыстычнага маршруту. У яго ўжо ўвайшлі і Замкавая гара, дзе зліваецца Днепр і Друць, і крыж Томашу Грыневічу, і вёска Азярышча, дзе, згодна з раманам «Каласы пад сярпом тваім», «ігруша цвіла апошні год»...

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с частичным использованием в качестве несущих элементов кладочного заполнения стен. Фундаменты свайные с монолитными железобетонными ленточными и столбчатыми ростверками. Наружные и внутренние стены техподполья – монолитные железобетонные. Колонны – монолитные железобетонные. Наружные и внутренние несущие стены жилой части из керамических поризованных блоков. Перегородки из пазогребневых полнотелых керамзитобетонных блоков. Перекрытия и покрытие – монолитные железобетонные плиты. Утепление наружных стен предусмотрено легкой штукатурной системой с минераловатными плитами. Лестницы – монолитные железобетонные марши и площадки. Кровля жилого дома – малоуклонная с покрытием из двух слоев кровельного материала. Кровля гаража-стоянки – эксплуатируемая под озеленение и автомобильные нагрузки с покрытием из тротуарных плит. Здание оборудовано тремя лифтами. Внутренняя отделка мест общего пользования предусмотрена с окраской стен, устройством плиточных полов и подвесных потолков.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы панельные. Вентиляция жилых помещений естественная. Вентиляция помещений кухонь, ванных и санузлов осуществляется через унифицированные вентблоки. Вентиляция гаража-стоянки – приточно-вытяжная с механическим побуждением. Здание оборудовано раздельными системами хоз-питьевого и противопожарного водоснабжения. В здании предусмотрена система дымоудаления из внеквартирных коридоров, система подпора воздуха в шахты лифтов. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной разводки электропроводки. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры в этажных щитах. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

Технико-экономические показатели жилого дома: количество жилых этажей – 25; количество секций – 1; количество квартир – 148, в том числе: однокомнатных – 51 (общей площадью от 38,17 до 41,63 кв. метров), двухкомнатных – 72 (общей площадью от 56,46 до 61,68 кв. метра), трехкомнатных – 25 (общей площадью 71,24 и 73,15 кв. метра). Общая площадь квартир – 7977,07 кв. метра.

**Строительная готовность жилых помещений:**

- частичная внутренняя отделка: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;
- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна, вытяжка через каналы унифицированных вентблоков;
- электроснабжение – поквартирная черновая разводка электропроводки с установкой розеток, выключателей, звонка, электросчетчика, без установки электроплиты;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель;
- канализация – стояк, установка и подключение унитаза;
- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);
- окна и двери на лоджии – из ПВХ профиля со стеклопакетом;
- остекление лоджий – из ПВХ профиля со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;
- видеодомофон;
- дверь входная деревянная;
- пожарный шланг;
- автономный пожарный извещатель.

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика (на дату опубликования проектной документации):**

- 4 (четыре) однокомнатные квартиры общей площадью по проекту от 38,17 до 41,63 кв. м. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры – 3100 (три тысячи сто) белорусских рублей при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период по графику платежей – 3200 (три тысячи двести) белорусских рублей;
- 4 (четыре) двухкомнатные квартиры общей площадью по проекту общей площадью от 56,46 до 61,68 кв. м. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры – 2850 (две тысячи восемьсот пятьдесят) белорусских рублей при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период по графику платежей – 2950 (две тысячи девятьсот пятьдесят) белорусских рублей.

Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства:

1. При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора создания объекта долевого строительства.
2. Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях, перечисляется дольщиком на специальный и расчетный счет застройщика в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договоров создания объекта долевого строительства осуществляются, начиная с первого рабочего дня, следующего за днем опубликования настоящей декларации, в порядке живой очереди по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Со дня начала заключения договоров создания объекта долевого строительства прием и регистрация заявлений на заключение договоров осуществляется при заключении договоров. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ООО «СИ-трейдинг» вправе заключить договор с другим претендентом.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: застройщик вправе изменить цену договора (цену объекта долевого строительства) в случаях изменения прогнозных индексов цен в строительстве в нормативный срок строительства объекта строительства и дополнительный срок строительства при продлении нормативного срока строительства в установленном законодательством порядке в случае отсутствия вины застройщика, а также изменения законодательства об уплате косвенных налогов в указанные сроки, если они оказали влияние на цену договора (цену объекта долевого строительства).

В возводимом жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться предпочтение гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

**Данные о вещном праве на земельный участок, предоставленном застройщику для строительства объекта долевого строительства, его границах и площади, элементах благоустройства:**

земельные участки находятся в постоянном пользовании ООО «СИ-трейдинг» с целевым назначением для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой, смотровых колодцев и инженерных сетей по объекту «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой». Свидетельство (удостоверение) №№ 600/1072-14293, 600/1072-14292, 600/1072-14291, 600/1072-14290, 600/1072-14289 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право постоянного пользования) с кадастровым номером 623680604101000376 площадью 0.5308 га, с кадастровым номером 623680604101000375 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000374 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000373 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000372 площадью 0,0001 га, расположенные по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, составленные РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру 24 мая 2019 года.

Проектом предусмотрено благоустройство придомовой территории, включая строительство площадок для парковки легкового автомобильного транспорта, тротуаров, пешеходных дорожек, площадки для игр детей, сбора твердых бытовых отходов.

**Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества:** два встроенных помещения административного назначения с отдельными входами на первом этаже, машино-места в подземном гараже-стоянке, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

**Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** в состав общего имущества совместного домовладения, поступающего в общую долевую собственность всех дольщиков, входят помещения инженерного назначения (электрощитовая, тепловой пункт, лифтовые шахты, водомерный узел, насосная), коридоры общего пользования, кладовые для уборочного инвентаря, лифты, лестнично-лифтовые холлы, межэтажные лестницы, тамбуры, конструкции водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилого дома, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства (площадки для раздельного сбора бытовых отходов, уличные парковочные места, проезды, тротуары, детская площадка), а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения жилого дома. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации многоквартирного жилого дома и передаются застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода в эксплуатацию это товарищество создано. Если такое товарищество не создано, – лицу, определяемому общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

**Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома:** август 2020 года.

**Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком:** договор строительного подряда № 22/05-2018 от 22.05.2018 г., заключенный застройщиком со Строительным унитарным предприятием «СИ-трейдинг-Строй».

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by

Далёкія міры

# «ТЭЛЕФОННАЯ ЛІНІЯ» ДЛЯ СУВЯЗІ З КОСМАСАМ

**Інжынеры NASA пачалі збіраць новую 34-метровую радыётэлерку ў каліфарнійскай частцы пустыні Махавэ. Яна дазволіць улоўліваць сігналы з далёкага космасу і павінна стаць адным з асноўных сродкаў сувязі з будучымі экспедыцыямі на Месяц і Марс. Пра гэта інфармуе Лабараторыя рэактыўнага руху NASA (JPL) на сваім сайце.**



«Антэны сеткі далёкай касмічнай сувязі NASA — наша галоўная «тэлефонная лінія», якая звязвае Зямлю і міжзорныя місіі «Вояджэр», а таксама ўсе марсіянскія місіі і апарат New Horizons за арбітай Плутону. Чым больш мы вывучаем Сонечную сістэму, тым больш антэн нам трэба для таго, каб мець камунікацыю з усімі гэтымі апаратамі», — пракаментаваў пачатак будаўніцтва намеснік дырэктара JPL Лары Джэймс.

Сетка далёкай касмічнай сувязі NASA (DSN) аб'ядноўвае ў сабе некалькі дзясяткаў магутных радыётэлерак, якія выпрацоўваюць магутныя імпульсы радыёхваль і ўлоўліваюць вельмі слабыя касмічныя сігналы. Яна складаецца з трох асобных комплексаў, што размешчаны на тэрыторыі абсерваторыі Голдстоўна на поўдні Каліфорніі, а таксама яе аналагаў у ваколіцах Мадрыда (Іспанія) і Канберы (Аўстралія).

Гэтыя антэны пастаўлены такім чынам, што спецыялісты NASA могуць кругласутачна падтрымліваць сувязь з усімі апаратамі і пілатуемымі місіямі, якія ЗША або іншыя краіны адпраўляюць у далёкі космас. Кожны комплекс абсталяваны трыма ці чатырма 34-метровымі антэнамі, а таксама некалькімі менш буйнымі прыёмнікамі і выпраменьвальнікамі.

У пачатку 2010 года кіраўніцтва NASA вырашыла пашырыць DSN, паколькі існуючых антэн не хапала для таго, каб падтрымліваць пастаянную сувязь з трыма дзясяткамі касмічных апаратаў.

У агульнай складанасці спецыялісты NASA планавалі ўстанавіць яшчэ шэсць 34-метровых антэны, па дзве ў кожным комплексе. Частка з іх ужо была ўведзена ў строй у Іспаніі і Аўстраліі за апошнія чатыры гады, а іншыя працягваюць будавацца.

Цяпер, як паведамляе прэс-служба JPL, інжынеры NASA пачалі збіраць новую антэну, якая будзе ўстаноўлена на тэрыторыі абсерваторыі Голдстоўна. Гэта першае абнаўленне амерыканскай часткі DSN з 2003 года. Згодна з планамі аэракасмічнага агенцтва, пабудова антэны, якая атрымала імя DSS-23, павінна завяршыцца прыкладна праз 2,5 года, да моманту адпраўкі першых паўторных экспедыцый на Месяц у рамках праграмы Artemis.

У ёй закладзена ўнікальная рыса, якая будзе адрозніваць антэну ад усіх астатніх радыётэлерак DSN. Тут установяць адмысловы набор люстэркаў і аптычных прыбораў, які дазволіць улоўліваць не толькі радыёсігналы, але і імпульсы лазернага выпраменьвання. Гэта дасць магчымасць выкарыстоўваць DSS-23 для звышхуткаснай перадачы інфармацыі з Марса і Месяца на Зямлю.

Першая праверка антэны пройдзе ў другой палове 2022 года, калі на арбіту будзе выведзены зонд Psyche, прызначаны для вывучэння астэроіда Псіхея. Ён абсталяваны эксперыментальнай лазернай сістэмай сувязі, пры дапамозе якой паспрабуе звязацца з DSS-23 і перадаць высакаякасныя адлюстраванні з космасу.

Вось табе і мур-мяў

# Раскрыты прычыны алергіі на кошак

**Аўстралійскія навукоўцы з Квінслендскага ўніверсітэта высветлілі, што адзіны вядомы атрутны прымат — павольны лоры — вылучае падобны да алергеннага бялку кошак яд. Пра гэта паведаміў часопіс Toxins.**



Пад пахамі ў гэтых бяскрыўдных на выгляд жывёл размешчаны залозы, якія вылучаюць небяспечны яд. Калі, напрыклад, лоры пагражае небяспека, то ён змазвае гэтым рэчывам зубы, і ад укусу рана ахвяры перайтвараецца ў незагойную. Калі такі ўкус атрымае чалавек, то ў яго будзе вялікая рызыка атрымаць алергічны шок.

Навукоўцы па выніках даследавання таксама ўстанавілі, што бялок сакрэту падпахавых залоз павольных лоры практычна ідэнтычны з алергенным бялком кошак. Такім чынам, была зроблена высnova, што хатнія гадаванцы таксама здольныя вылучаць бялкі, якія выклікаюць у людзей алергію. Робяць яны гэта для абароны ад іншых жывёл або для абазначэння сваёй тэрыторыі.

Эксперты перакананы, што вынікі даследавання прымусяць паглядзець на алергію на кошак у зусім новым аспекце, што дапаможа знайсці эфектыўны спосаб барацьбы з ёй.

Дарэчы, у красавіку 2019 года ў лабараторыі імунапаталогіі НДІ малекулярнай медыцыны расказалі аб распрацоўцы ў Расіі першай у свеце вакцыны ад алергіі на кошак.

Назад у мінулае

# ПАКАШТАВАЦЬ ФІНІКІ, ЯКІМ... ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ

**Навукоўцы здолелі вырасціць старажытныя расліны з насення, якое знайшлі падчас раскопак на тэрыторыі сучаснага Ізраіля.**

Як піша Newsweek, гаворка ідзе пра шэсць іўдзейскіх фінікавых пальмаў, што праraслі з насення, якому каля дзвюх тысяч гадоў. Гэтыя расліны — адны з самых старажытных фруктовых дрэў у свеце, якія «прыручыў» чалавек. Фінікавыя пальмы адыгрываюць сімвалічную ролю на Блізкім Усходзе, а таксама ў мусульманстве, хрысціянстве і іўдаізме.



Даследаванні сведчаць, што вырошчваннем гэтых раслін чалавецтва займалася яшчэ ў Месапатаміі і Верхнім арабскім заліве каля сямі тысяч гадоў таму. Плады іўдзейскай фінікавай пальмы шанаваліся ў старажытным свеце за іх памер, салодкі смак і доўгі тэрмін захоўвання, а таксама за лячэбныя ўласцівасці.

«Я ўрач, і на працягу апошніх 20 гадоў вывучала пэўныя медыцынскія расліны ў гэтым рэгіёне, — кажа галоўны аўтар праекта з Цэнтра даследавання натуральнай медыцыны Луіса Борыка ў Ізраілі Сара Салон. — Наша праца паказала, што многія расліны сталі вельмі рэдкімі ці аказаліся пад пагрозай знікнення».

Яна адзначыла, што ў антычныя часы на тэрыторыі краіны раслі вядомыя фінікавыя дрэвы, якія цяпер зусім зніклі. Калі Іўдзея трапіла пад праўленне Рымскай імперыі, фінікі вельмі шанаваліся захопнікамі. Таму плады пальмы экспартавалі ў іншыя часткі свету. Культывацыя фінікавых пальмаў у рэгіёне працягвалася ў перыяды Візантыі і арабскага праўлення (IV—XI стагоддзі нашай эры). Але да XIX стагоддзя ад гэтай культуры дрэў не засталося і следу. Адна з прычын — змяненне клімату. Аднак знікненню дрэў садзейнічала і знішчэнне інфраструктуры з-за хваляў заваяванняў.

У 2005 годзе каманда на чале з Салон змагла прарасціць насенне іудзейскай фінікавай пальмы, якому 1900 гадоў. Яго знайшлі на гістарычным месцы паблізу Мёртвага мора ў Ізраілі. Пасля першага поспеху Салон разам з калегамі вырасцілі шэсць іўдзейскіх фінікавых пальмаў, якім дзве тысячы гадоў. Іх таксама знайшлі падчас археалагічных раскопак у іўдзейскай пустыні каля Мёртвага мора ў 1963 і 1991 гадах.

Пласты гісторыі

# ДРАЎЛЯНЫ КАЛОДЗЕЖ З КАМЕННАГА СТАГОДДЗЯ

**Ва Усходняй Чэхіі пры будаўніцтве аўтамагістралі натрапілі на калодзеж узростам звыш за 7,5 тысячы гадоў. Аб гэтым піша часопіс Journal of Archaeological Science.**

Артэфакт знайшлі паблізу чэшскага горада Остраў. Ён уяўляў сабой драўляны зруб студні эпохі ранняга неаліту. Збудаванне размяшчалася ніжэй за ўзровень грунтавых вод, таму і добра захавалася.

Аб'ект мае квадратную форму 80 на 80 сантыметраў і вышыню 140 сантыметраў. Па вуглах укапаныя чатыры рыфленыя дубовыя слупы, сценкі калодзежа ўмацаваныя ўстаўленымі паміж слупамі плоскімі дошкамі са слядамі апрацоўкі паліраванымі каменнымі прыладамі. Дэндраханалагічнае датаванне паказала, што дрэвы, з якіх зроблены вуглавыя слупы, былі ссечаны ў 5481 годзе да н.э. Бакавыя дошкі адносяцца да 5256—5255 гадоў да н. э., а адна з іх — да перыяду ад 5241 да 5224 года да н. э. Гэта сведчыць аб тым, што калодзеж неаднаразова рамантавалі.



Таксама спецыялісты змаглі зрабіць высновы аб складзе мясцовых лясоў таго часу, паколькі дошкі былі выраблены з дубу, арэшніку. Акрамя таго, эксперты прыйшлі да высновы, што ў познім каменным стагоддзі жыхары Еўропы валодалі навыкамі ды інструментамі і маглі адаптаваць асяроддзе пад свае патрэбы.

Па словах археолагаў, калодзеж можа апынуцца найстаражытнейшым са знойдзеных у свеце драўляных прадметаў. Пакуль рэкорд афіцыйна не пацверджаны. У Еўропе ёсць каля 40 падобных збудаванняў гэтага перыяду, піша «Газета.ру».

Калі існавалі дыназаўры

# Выкапнёвы яшчар з магутным укусам

**У Бразіліі выявілі парэшткі продка кракадзіла. Паведамляецца, што нічога падобнага да гэтага часу не знаходзілі. Істота жыла каля 230 мільёнаў гадоў таму і мела неверагодна магутны ўкус.**

Высветлілася, што выкапень жывёлы невядомага віду, выяўлены палеантолагамі, з'яўляецца далёкім продкам сучасных кракадзілаў. Артыкул, прысвечаны гэтай знаходцы, з'явіўся на старонках тэматычнага выдання Acta Palaeontologica Polonica. Старажытны продак кракадзілаў быў знойдзены пры вывучэнні скамянелага бруду, назапашанага каля падножжа ўзгорка Агуда. Апошні размешчаны ў гадзіне язды ад Порту-Алегрэ, яго вывучалі навукоўцы з Федэральнага ўніверсітэта Санта-Марыі, групу якіх узначаліў палеантолаг Радрыга Мюлер.

Вучоны першым звярнуў увагу на дзіўную закамянеласць. «Нічога падобнага да гэтага часу палеантолагі не выяўлялі на тэрыторыі краіны, таму знаходку можна лічыць па-сапраўднаму ўнікальнай. Цяпер мы ведаем, што тэрыторыя сучаснай Бразіліі была домам для самых першых дыназаўраў на Зямлі», — кажа Мюлер. Шкілет, які палеантолагі дасталі са старажытнага скамянелага бруду, належаў прадстаўніку сямейства Ornithosuchidae. Раней падобных яшчараў знаходзілі толькі ў Шатландыі і Аргенціне. Новы від атрымаў назву Dynamosuchus collisensis. Істота, мяркуючы па асаблівасцях яе сківаў, мела неверагодна магутны ўкус — гэты факт дазваляе выказаць здагадку, што жывёла харчавалася ў асноўным трупамі, гэта значыць, была падобнай на сучасных грыфаў і гіен. Укус рэптыліі мог раздрабніць косткі, а зубы, падобныя на ляза, ірваць мяса. Мюлер лічыць, што Dynamosuchus collisensis быў павольным здыхлятнікам.

Гэтая жывёла была досыць вялікай у параўнанні з іншымі, якія жылі ў гэты перыяд, даўжынёй больш за два метры. У адрозненне ад сваіх сучасных сваякоў-кракадзілаў, Dynamosuchus collisensis быў земнаводным. Яго чатыры канцавіны знаходзіліся пад целам, а не з бакоў. Таксама ўстаноўлена, што дагістарычная рэптылія была досыць павольнай. Верагодна, таму яна і кармілася ў асноўным трупамі жывёл, а часам, магчыма, лавіла даступную здабычу. Гэта азначае, што істота была вельмі важным звяном у харчовым ланцугу, пры існаванні якой у гэтым рэгіёне Бразіліі палеантолагі да гэтага часу нічога не ведалі. Закамянеласць Dynamosuchus collisensis добра захавалася, таму Мюлер і іншыя даследчыкі могуць праводзіць далейшыя тэсты на трываласць укусу рэптыліі, выкарыстоўваючы камп'ютарную тамаграфію для стварэння трохмерных лічбавых мадэляў.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# З ЛЮБОЎЮ І НЯНАВІСЦЮ ЗЯМНОЮ

## Генадзь Бураўкін: згадкі і роздум

ТРОЙЧЫ Генадзь Бураўкін быў на мяжы небыцця. Не ў метафарычным, не ў паэтычным, а ў самым прамым, літаральным сэнсе гэтага слова.

Першы раз гэта здарылася ў вайну. У дзін з зімовых дзён сорак чацвёртага ўсіх насельнікаў невялікай расонскай вёскі Шуляціна карнікі сагналі на яе ўскраек.

«...Мы стаім на ўзгорку трыма радамі, — прыгадваў пазней паэт. — Першы, рэдзенькі — мужчыны, дзяды; другі, заплаканы, няроўны — жанчыны з малымі на руках і трэці — мы, каму шэсць — дзесяць — дванаццаць гадоў. На нас нацэлены кулямёт, за ім — як сёння помню — ляжыць здаравенны немец у даўгім шынялі. Стаяць на ўзгорку і паліцаі — там, за кулямётам, па той бок. Мы чакаем, чакаем стрэлаў. Плачуць жанчыны, маўчаць дзяды. А стрэлаў усё няма...

Пад вечар нас сагналі ў лазню на ўскрайку вёскі... Я тады не ведаў, што дзверы лазні забіты цвікамі, што лазня абкладзена саломай і паліцаі пайшлі шукаць газы ці бензіну...

Я не помню твару таго, хто вызваліў нас. Помню толькі, што гэта быў немец, радавы салдат, сівы. Ён не ўмеў гаварыць па-руску і ўсё махаў рукамі ў бок лесу... Мы ўсе ўцяклі, усе ўратаваліся. У партызанскім лагеры сустрэлі чырваназорныя танкі, нашу армію...»

У другі раз (а гэта было ў канцы дзевяностых) Генадзь Мікалаевіч не толькі зазірнуў у вочы вечнасці, але і пабыў там некалькі хвілін. Падчас вострай дыскусіі з апанентам ягонае сэрца спынілася. На шчасце, побач аказаўся калега Алесь Масарэнка, які здолеў аказаць патрэбную дапамогу. Урачы пасля сказалі: «Буйнаачаговы інфаркт міякарда. Лічыце, што вы нарадзіліся ў сарочцы...»

На мяжы небыцця Бураўкін пабыў і вясною 2009 года. Ягонаму збалеламу, параненаму сэрцу запатрабавалася аорта-каранарнае шунціраванне. Няпроста было рашыцца на гэтую цяжкую, складаную аперацыю. Дзякуй Богу і ўрачам, усё абышлося. І яшчэ цэлых пяць гадоў Генадзь Мікалаевіч мог паўнавартасна радавацца жыццю, пісаць вершы.

* * *

Гэтыя поўныя драматызму эпізоды я прыгадаў невыпадкова. Яны, па прызнанні самога паэта, сталіся не проста запамінальнымі, але і ў пэўнай ступені вызначальнымі ў ягоным жыцці. Той хлапчукоўскі страх пад дулам нямецкага кулямёта, што ледзяніў душу мацней за студзеньскі мароз, значна пазней адгукнуўся ў вершах, стаў асноваю паэмы «Хатынскі снег».

«Вайна жыве ўва мне, — пісаў Бураўкін у сваёй першай пісьменніцкай аўтабіяграфіі. — Пяцігадовым хлапчуком на акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі... я бачыў і чалавечую подласць, і чалавечую высакароднасць». Гэтыя адчуванні, гэтыя пачуцці, можна сказаць, вызначалі і фарміравалі светаадчуванне паэта, гартавалі яго грамадзянскую пазіцыю.

Генадзь Мікалаевіч лічыў, што і тыя выпрабаванні, якія выпалі на яго долю ў апошнія гады, таксама былі для нечага пасланы Богам. Ва ўсялякім разе, ён лішні раз пераканаўся, што ў яго нямала сапраўдных сяброў, якія падтрымалі яго ў цяжкую часіну, далі зразумець, што ён нешта значыць у гэтым жыцці. А гэта надзвычай важна: адчуваць важнасць таго, што ты робіш.

Генадзь Бураўкін даволі рана вызначыў (а дакладней, адчуў) сваё пакліканне, сваё жыццёвае прызначэнне — служыць роднаму слову. Першыя вершы былі надрукаваны ў полацкай абласной газеце, калі ён яшчэ вучыўся ў школе. Тады ж адбылася і публікацыя ў «Полымі» — галоўным літаратурным часопісе. Відома, усё гэта акрыляла, надавала ўпэўненасці ў сваіх сілах.

Аднак сапраўдным пачаткам сур'ёзнай літаратурнай работы Генадзь Мікалаевіч лічыў студэнцкія гады, калі ён вучыўся ва ўніверсітэце на аддзяленні журналістыкі. Аглядваючыся на той час, паэт прызнаваўся: «...у прынцыпе я шчаслівы, што, як мне здаецца, угадаў свой лёс і, калі, можа быць, не вельмі змог раздзьмуць, дык усё-такі не затаптаў тую іскрынку, якую падараваў мне Бог...»

* * *

Творчы лёс Генадзя Бураўкіна склаўся даволі шчасліва. Ягоныя вершы адразу вылучылі і палюбілі чытачы, заўважылі і адзначылі крытыкі. Паэт быў уганараваны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі і Дзяржаўнай прэміяй імя Янкі Купалы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Бураўкіна нярэдка папракалі за ягоную залішнюю эмацыянальнасць, выбуховасць характару. У гэтых папроках ёсць доля праўды. Паэт і сам разумеў, што часам лепш было б змаўчаць, не рэагаваць на дробязі. Але што зробіш? «Такі ў мяне характар, такі ў мяне тэмперамент. Так, у сваіх перакана괄нях, у цвёрдасці пазіцый я іншы раз, напэўна, занадта катэгарычны, але я гэтага не баюся. Абы не было папрокаў у нячэснасці... З гадамі я, спадзяюся, стаў спакайнейшым, мудрэйшым».

І гэта праўда. З гадамі ён адышоў ад максімалісцка-юначага, чорна-белага ўспрыняцця рэчаіснасці. Крытыка дзеля крытыкі — не ягоны прынцып. Ён імкнуўся крытыкаваць не тую або іншую асобу, а яе канкрэтныя дзеянні.

Гаварыць з Генадзем Мікалаевічам было заўсёды цікава. У яго на кожную падзею меўся свой погляд, часам нечаканы, парадаксальны, але абавязкова аргументаваны, асветлены яго багатым і жыццёвым, і літаратурным, і дыпламатычным вопытам.

Часцей за ўсё мы, вядома, размаўлялі пра літаратуру. Мяне здзіўляла неспатольная цікавасць Генадзя Мікалаевіча да ўсяго, што тут адбываецца. Чытаў ён амаль усё, што друкавалася ў часопісах «Полымя», «Маладосць», «Дзеяслоў». Уважліва сачыў за кніжнымі навінкамі. Шчыра радаваўся (што, дарэчы, вялікая рэдкасць сярод пішучай брацыі) творчым удачам сяброў, калег. Засмучаўся дзіўнай грамадзянскай інфантыльнасцю многіх маладых літаратараў, іх празмернай захопленасцю фармальнымі пошукамі, псеўданаватарствам...

* * *

...На чарговым шпацыры ў парку гаворка зайшла пра сучасную беларускую літаратуру.

— Што такое паэзія?— перапытвае мяне Генадзь Мікалаевіч. — Гэта нешта высокае, таямнічае, Боскае. Таму і паэты ў нашым грамадстве заўжды ўспрымаліся як прарокі. Яны нават знешне вылучаліся. Вазьмі таго ж Максіма Багдановіча, Янку Купалу. Альбо пазнейшае пакаленне — Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанку. Ці, скажам, нашае пакаленне — Ніла Гілевіча, Янку Сіпакова, Васіля Зуёнка... Усе яны — прыгожыя, светлыя хлопцы.

...Загаварылі пра мову. Кажу, што многія з нашых пісьменнікаў пачалі ўжываць розныя паланізмы ды ўкраінізмы: адсоткі (працэнты), унёсак (уклад), мапа (карта), мінак (пешаход), брамнік (варатар), гулец (ігрок), кіроўца (шафёр), заўзятар (балельшчык) ды іншае.

Кажу, што гэта робіцца не ў час. Наша бедная мова і так ледзь хаўкае, ледзьве жывая, а тут яе засмечваюць, дабіваюць дарэшты. Навошта гэта рабіць? Толькі дзеля таго, каб не была падобная да рускай мовы?

— Не, справа не ў гэтым, — не пагадзіўся Бураўкін. — Хутчэй за ўсё, гэта тлумачыцца тым, каб адысці ад наркамаўкі.

— Дык жа не цяпер гэта рабіць!

— От і я кажу. Трэба спачатку разабрацца з тым, што маем, а тады ўжо займацца рэфармаваннем.

* * *

Некалькі важных думак Бураўкіна з яго нядаўняга, юбілейнага інтэрв'ю.

**Пра высокае і нізкае.**

— Мяне часам да шаленства даводзіць тое, наколькі нізкі духоўны ўзровень і інтэлектуальнага жыцця, і многіх твораў. Што такое для гісторыі, для грамадства, для чалавецтва (не будзем баяцца высокіх слоў), хто з кім пераспаў, хто з кім ажаніўся, хто каго абдурыў? Гэта ў жыцці было, ёсць і будзе, але заўсёды — мне так здавалася — было і нешта высокае, да чаго трэба было імкнуцца, арыентуючыся на што трэба было жыць. Дык вось, у тыя, савецкія часы, хай фармальна, былі заклікі, было імкненне да нечага высокага. Не ва ўсіх, але было.

**Пра таленавітае і бяздарнае.**

— «Большое видится на расстояньи...» Гэта, канешне, сказана геніяльна і дакладна, але гучыць яно ў нейкім сэнсе як апраўданне. Апраўданне палітычнае і нават мастацкае. Маўляў, чаго вы сёння даяце такую ацэнку, пачакайце, прыйдзе час, тады будзе бачная праўда. А я думаю, у мастацтве, у той жа літаратуры, некаторым рэчам не трэба адлегласць, каб даць ім справядлівую ацэнку. Калі што бяздарнае, то яно ўжо і сёння бяздарнае. Калі добрае — то відно, што добрае. Іншая справа, што час можа зрабіць папраўку: ці ўзвялічыць, ці, наадварот, прынізіць. Але мне хочацца, каб гэта здарылася пры нас, каб у нашым часе мы адчувалі справядлівую цану таму, што маем.

**Пра актуальнасць класікі.**

— Апошнім часам, можа, таму што пастарэў ці пасталеў, можа, таму што хваробы прымушалі да засяроджвання больш, чым раней, я люблю перачытваць класікаў. І не толькі адкрыў для сябе нешта новае, як заўсёды бывае, калі перачытваеш класікаў, я ў нейкім сэнсе жахнуўся ад іхняй злабадзённасці. Таму што ўсё ж такі хочацца верыць, што прагрэс, у тым ліку і духоўны, ідзе. А атрымліваецца як? Чытаю Гогаля — сённяшні дзень, чытаю Салтыкова-Шчадрына — гэта не проста сённяшні дзень, гэта ў дэталях абсалютна дакладны здымак сённяшняй сітуацыі ў грамадстве. Я не ведаю — ці то радавацца за класікаў, якія яны былі мудрыя, ці жахацца за грамадства, за прагрэс...

* * *

...Генадзь Мікалаевіч раптам паведаміў, што трапіў у рэанімацыю, не падымаецца з ложка. І стан яго, відаць, неважнецкі, бо гаварыў нейкім здушаным голасам, неахвотна:

— Мне цяпер не да чытання, не да размоў. Дый бачыць у нікога не хачу.

Такая заява мяне зусім засмуціла. Не дай Бог, што-небудзь сапраўды сур'ёзнае.

Бураўкіна перавезлі ў лечкамісію. Яму стала нібыта лепш. Аднак ён усё яшчэ не падымаецца, нават сядзець не можа — баліць. І гаварыць цяжка: скажа фразу — і адпачывае...

Як ні змагаўся Генадзь Мікалаевіч з праклятаю немаччу, як ні чапляўся за жыццё (так хацелася яму дачакацца кнігі), усё ж страшная хвароба перамагла. Майго старэйшага сябра, майго любімага паэта не стала. Адмаяўся, адпакутаваў, адгараваў. Адышоў у лепшы свет...

* * *

...Ужо шосты год, як няма з намі Генадзя Бураўкіна. Гэтымі днямі пра яго думаецца асабліва цёпла, сардэчна.

Я выдатна разумею ўсю веліч і значэнне Бураўкіна як паэта, як грамадскага дзеяча, як грамадзяніна. Але сёння мне хочацца сказаць колькі слоў пра яго проста як пра чалавека, блізкага таварыша, шчырага сябра.

Больш за сорак гадоў Генадзь Мікалаевіч быў у маім жыцці. А ў апошнія дзесяць—пятнаццаць гадоў — вельмі блізка. Я мог у любы час патэлефанаваць яму, паспавядацца, параіцца, нечаму разам парадавацца ці засмуціцца. А калі ўжо вельмі кепска было на душы, то ішоў да яго на сустрэчу, нібы на споведзь і прычашчэнне.

А была ў нас яшчэ адна агульная захопленасць — грыбы. Як толькі на Камароўцы з'яўляліся першыя каласавікі, Генадзь Мікалаевіч ужо званіў-непакоіўся:

— А можа з'ездзім?..

Наша любімая мясціна — верасовыя, звонка-векавыя бары на Уздзеншчыне, за Магільнам. Там, на ўскрайку жытнёвага поля, на ўтульнай лясной палянцы, была ў нас свая запаветная мясціна. Мы атабарваліся каля вялікіх, нагрэтых скупым асеннім сонцам валуноў, раскладвалі цяпельца, смажылі на ражончыках сала, бралі чарку — і гаманілі, гаманілі... Часам гамонка займала больш часу, чым збіранне грыбоў. І гэта былі хвіліны высокай душэўнай еднасці, безаглядней шчырасці і, як я цяпер разумею, хвіліны сапраўднага, на жаль, ужо незваротнага шчасця.

Што зробіш... Ужо амаль шэсць гадоў, як Генадзя Мікалаевіча няма з намі. Але, далібог, я па-ранейшаму адчуваю яго прысутнасць. Па-ранейшаму жыву, звяраючы па ім свае думкі, свае пачуцці, свае ўчынкі. Калі стаю перад нейкім няпростым выбарам, то перш за ўсё прыкідваю: а як бы ў гэтым выпадку паступіў Генадзь Мікалаевіч?

А калі бывае журботна, скрушна на душы, я разгортваю яго кнігі — і яго паэзія наталяе мяне спакоем і мудрасцю.

А яшчэ я маю неацэнны скарб — восем гадзін дыктафоннага запісу гутаркі з Генадзем Мікалаевічам. Калі я ўключаю камп'ютар і чую яго голас — ствараецца поўная ілюзія, што ён нікуды не сыходзіў. Што ён побач...

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта / адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Весенняя, 5А** и земельный участок | 121280400101000063 | 0,1130 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **77 928,71** | 15 580,00 | **1834,71** | 0,0012 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0014 га – на мелиорируемых (мелиорированных землях) |
| 2 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Берестовая, 42** и земельный участок | 140100000001032170 | 0,0990 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **31 902,45** | 6300,00 | **2835,13** | 0,0017 га – охранная зона линий связи и радиофикации; 0,0036 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,0990 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях |
| 3 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **улица Лыщицкая, 23** и земельный участок | 140100000001032169 | 0,1177 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **26 381,00** | 5200,00 | **2923,90** | 0,0100 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0048 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления) |

**Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — **2700,00 руб.**

**Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- часть платы предмета аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• не позднее одного месяца с момента подписания акта приема-передачи получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• заключить договор на разработку проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома в течение 20 календарных дней с даты получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и в срок, не превышающий 3 месяцев с даты заключения данного договора, обеспечить ее изготовление;

• представить изготовленную проектную документацию для утверждения в Брестский городской исполнительный комитет в течение 30 календарных дней с даты ее изготовления;

• завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся

**Аукцион состоится 19 марта 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.**

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 18.02.2020 г. до 16.15 13.03.2020 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, **www.city.brest.by** и www gki.gov.by

## Дукорский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области 20 марта 2020 года в 15.00 в здании Дукорского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: аг. Дукора, ул. Речная, д. 14 Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Наличие ограничений | Расходы по подготовке документации (руб.) | Начальная цена (руб.) | Задаток (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** аг. Дукора, ул. Червякова, 96А 624483402101001643 | 0,1164 | Сети электроснабжения, газоснабжения водоснабжения | Водоохранная зона реки Свислочь | 1387,60 + расходы за объявления в СМИ | 5208,67 | 520, 87 |
| **Лот № 2** д. Подлипки, ул. Центральная, 38 624483405101000088 | 0,1500 | Сети электроснабжения, газоснабжения | Охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт площадью 0,0004 га | 1576,57 + расходы за объявления в СМИ | 5635,50 | 563,55 |
| **Лот № 3** д. Подлипки, уч. 5 624483405101000092 | 0,1497 | Сети газоснабжения | Охранная зона объектов газораспределительной системы площадью 0,0114 га, охранная зона линий связи и радиофикации площадью 0,0171 га | 1759,08 + расходы за объявления в СМИ | 5061,81 | 506,18 |
